# ЗВАРОТ

## Савета кіраўнікоў дзяржаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў у сувязі з 25-й гадавінай аварыі на Чарнобыльскай АЭС

26 красавіка 2011 года спаўняецца 25 гадоў з дня чарнобыльскай трагедыі — найбуйнейшай тэхнагеннай і сацыяльнай катастрофы XX стагоддзя. Гэты дзень у дзяржавах — удзельніцах Садружнасці Незалежных Дзяржаў аб'яўлены Міжнародным днём памяці ахвяр радыяцыйных аварый і катастроф.

Праблемы, звязаныя з наступствамі чарнобыльскай трагедыі, не страцяць актуальнасці і для будучых пакаленняў. Такія катастрофы ператвараюць пацярпелыя тэрыторыі ў зоны крызісу на многія дзесяцігоддзі.

Мы помнім мужнасць і самаадданасць соцень тысяч удзельнікаў ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС з усіх рэспублік, якія ўваходзілі ў склад СССР. Рызыкуючы жыццём і здароўем, яны выканалі свой абавязак і прадухілілі далейшае распаўсюджванне згубных радыеактыўных выкідаў.

Нягледзячы на прымаемыя меры, наступствы Чарнобыля прадаўжаюць аказваць негатыўны ўплыў на жыццё ў пацярпелых дзяржавах. Пад спецыяльным медыцынскім наглядам павінны знаходзіцца некалькі мільёнаў чалавек. У асобных раёнах па-ранейшаму неабходны буйнамаштабныя ахоўныя мерапрыемствы, без якіх немагчыма забяспечыць умовы бяспечнай жыццядзейнасці людзей, якія пражываюць на забруджаных тэрыторыях.

Важнейшай задачай пераадолення наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС з'яўляецца комплексная радыяцыйная і сацыяльна-эканамічная рэабілітацыя забруджаных тэрыторый, развіццё сацыяльнага і эканамічнага патэнцыялу пацярпелых рэгіёнаў. Вырашэнне гэтай задачы патрабуе новых навукова абгрунтаваных падыходаў, значных рэсурсаў і, як вынік, фінансавага, навуковага і тэхнічнага садзейнічання з боку міжнароднай супольнасці.

Пэўныя захады ў гэтым напрамку ўжо зроблены: Генеральная Асамблея ААН абвясціла трэцяе дзесяцігоддзе пасля Чарнобыля, 2006—2016 гады, Дзесяцігоддзем рэабілітацыі і ўстойлівага развіцця пацярпелых рэгіёнаў, ажыццяўленне якога павінна быць накіравана на забеспячэнне вяртання пацярпелага насельніцтва да нармальнага жыцця. Рэалізуецца адпаведны план дзеянняў ААН.

Мы з задавальненнем адзначаем, што Генеральная Асамблея ААН вітала рашэнне Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД аб'явіць 26 красавіка Міжнародным днём памяці ахвяр радыяцыйных аварый і катастроф у дзяржавах — удзельніцах Садружнасці, а таксама прапанавала дзяржавам — членам ААН адзначаць гэты Дзень і праводзіць адпаведныя мерапрыемствы ў памяць аб ахвярах радыяцыйных аварый і катастроф.

Адзначаючы 26 красавіка як Міжнародны дзень памяці ахвяр радыяцыйных аварый і катастроф і аддаючы даніну памяці загінулым у выніку чарнобыльскай катастрофы, заяўляем аб рашучасці стварыць неабходныя ўмовы для забеспячэння сацыяльнай абароны ўдзельнікаў ліквідацыі аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Лічым, што ўсебаковае супрацоўніцтва і абмен вопытам паміж дзяржаўнымі і грамадскімі арганізацыямі нашых краін дасць магчымасць сумеснымі намаганнямі пераадолець наступствы гэтай катастрофы.

Заклікаем сусветную супольнасць прадоўжыць супрацоўніцтва ў гэтай сферы, актыўна выкарыстоўваць новыя формы ўзаемадзеяння, што прадугледжваюць пераход да скаардынаванай дзейнасці, якая дапаўняе маштабныя намаганні дзяржаў па адраджэнні пацярпелых рэгіёнаў.

## Абзац

◢ Гаспадаркі Беларусі пасеялі ранні яравыя зерневыя і зернебабовыя культуры на 21,5% адведзеных пад іх плошчаў. У Брэсцкай і Гомельскай абласцях гэтыя культуры пасеяны больш чым на палове плошчаў.

◢ **У выніку моцнага ветру ўчора ў Брэсцкай вобласці зафіксавана адключэнне электраэнергіі ў 101 населеным пункце ў 5 раёнах — Баранавіцкім, Ляхавіцкім, Івацэвіцкім, Пружанскім і Столінскім. Акрамя гэтага, былі пашкоджаны дахі многіх жылых і сельскагаспадарчых пабудоў. У Століне ўпаў франтон дома, што будаваўся. З двух МТФ у в. Калазубы Пружанскага раёна сарвана 850 кв.м прафнасцілу, з кароўніка ў в. Лес Столінскага раёна — 600 лістоў шыферу. Паведамляецца таксама аб 4 выпадках пашкоджання дахаў у Пінскім раёне.**

◢ На перасячэнні вул. Сурганава і праспекта Незалежнасці ў Мінску (раён станцыі метро «Акадэмія навук») учора маршрутка ўрэзалася ў аўтобус №37. Да месца здарэння накіраваліся «хуткія» і ДАІ. На працягу гадзіны шматкіламетровыя чэргі літаральна паралізавалі рух у цэнтры сталіцы. У аварыі пацярпелі 2 пасажыры маршруткі. Яны шпіталізаваныя з нязначнымі траўмамі. Як мяркуецца, маршрутка выехала на скрыжаванне на «жоўты» ў спадзяванні «праскочыць».

◢ **Міліцыя выявіла ў Заслаўі падпольную лабараторыю па вытворчасці амфетаміну, што размяшчалася ў гаражы. Затрыманы 2 чалавекі.**

◢ Навукоўцы назвалі самыя шчаслівыя жаночыя імёны. Супрацоўнікі расійскага даследчага цэнтра «Імперыя кадраў» падчас аналізу рынку працы па гендарнай прыкмеце вызначылі імёны самых актыўных і паспяховых прадстаўніц прыгожага полу. Згодна з вынікамі даследавання, найбольш актыўнымі і ініцыятыўнымі з'яўляюцца жанчыны з імёнамі Алена. Затым ідуць Вольгі і Наталлі, якія вызначаюцца мэтанакіраванасцю, потым — Ірыны, Таццяны, Кацярыны, Ганны, Юліі, Святланы і Марыі. Даследаванне таксама паказала, што ад імені залежыць і сфера дзейнасці. Алены больш схільныя да выбару творчай прафесіі, Ірыны аддаюць перавагу маркетынгавай дзейнасці, Юліі часцей за ўсё сустракаюцца сярод аналітыкаў, а Святланы выбіраюць медыцыну.

## Поўны абзац

◢ **Жыхарка горада Ленінск-Кузнецкі Кемераўскай вобласці нарадзіла дзіця ў офісе банка. Як паведамляюць інфармагенцтвы, па тэрмінах роды павінны былі пачацца пазней, і жанчына толькі ў аддзяленні банка зразумела, што ў бальніцу не паспявае. Роды ў яе прынялі супрацоўнікі банка. «Яна падышла да акенца і, працягваючы дакументы, сказала: «Мне дзве тысячы рублёў і «хуткую», — расказала старшы кантралёр-касір Марына Баравікова. Персанал філіяла не толькі выклікаў «хуткую дапамогу», але і дапамог дзіцятку нарадзіцца. До моманту прыезду ўрачоў насельніцтва Ленінск-Кузнецкага павялічылася на аднаго чалавека. У многім роды прайшлі паспяхова таму, што жанчына нараджала пятае дзіця і сама гаварыла супрацоўніцам банка, што рабіць.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

Ва Урадзе

Уладзімір СЯМАШКА:

# «Каб вырашаць праблемы адмоўнага знешнегандлёвага сальда, трэба проста больш прадаваць на экспарт»

**ТОЕ, што сёння валютны рынак краіны перажывае не лепшыя часы, эксперты тлумачаць у тым ліку і ростам адмоўнага гандлёвага сальда. Каб вырашаць апошнюю праблему, зазначыў падчас сустрэчы з журналістамі першы віцэ-прэм'ер Беларусі Уладзімір СЯМАШКА, трэба проста больш прадаваць на экспарт. Сёлета, паведаміў ён, напрыклад, прадпрыемствам Мінпрама пастаўлена задача выйсці на станоўчае сальда знешняга гандлю ў 2,8 мільярда долараў ЗША.**

І, мяркуючы па ўсім, яна цалкам выканальная. Таму што, паводле папярэдніх звестак, у першым квартале Міністэрства прамысловасці выйшла на станоўчае сальда знешняга гандлю ў 680 мільёнаў долараў. Наогул, падводзячы вынікі працы айчынных прадпрыемстваў за тры першыя месяцы гэтага года, Уладзімір Сямашка адзначыў, што яны спрацавалі паспяхова і забяспечылі высокі паказчык па тэмпах росту прамысловай вытворчасці — за студзень-люты ён склаў 111,1 працэнта. Прычым некаторыя прадпрыемствы дэманструюць зайздросныя вынікі не толькі па вытворчасці прадукцыі, але істотна дадалі і ў тэмпах прыросту экспарту. У прыватнасці, Уладзімір Сямашка згадаў, што той жа МАЗ забяспечыў у першым квартале тэмп росту вытворчасці 175,6 працэнта, а тэмп росту экспарту — 232,4 працэнта.

Гаворачы пра перспектывы развіцця прамысловага комплексу краіны, першы намеснік прэм'ера паведаміў, што ў бягучай пяцігодцы ў яго мяркуецца інвеставаць амаль у 4 разы больш сродкаў, чым за папярэднія пяць гадоў. «Калі ў мінулай пяцігодцы мы інвеставалі з усіх крыніц на гэтыя мэты 27 трыльёнаў рублёў, то ў бягучай пяцігодцы гэты аб'ём павінен вырасці да 96-98 трыльёнаў і нават да 100 трыльёнаў рублёў», — сказаў ён. Для нарошчвання інвестыцый у прамысловую вытворчасць распрацавана адпаведная інвестыцыйная праграма, якая будзе ў бліжэйшы час зацверджаная.

Уладзімір Сямашка таксама паведаміў, што ў чэрвені будзе падпісана крэдытнае пагадненне па фінансаванні будаўніцтва беларускай АЭС. 22 сакавіка ў Маскве сустракаліся міністры фінансаў Беларусі і Расіі, якія абмеркавалі ўсе пытанні па гэтым пагадненні, дамовіліся пра ўсе ўмовы крэдыту. Чакаецца, што ўжо ў канцы гэтага месяца наша краіна атрымае праект крэдытнага пагаднення аб выдачы дзяржаўнага крэдыту на будаўніцтва АЭС. Першы віцэ-прэм'ер нагадаў, што падчас апошняга візіту Уладзіміра Пуціна ў Мінск на пасяджэнні саюзнага Саўміна былі падпісаны два пагадненні — аб будаўніцтве АЭС і аб паралельнай працы энергасістэм. Паводле слоў Уладзіміра Сямашкі, падпісаныя пагадненні адкрываюць дарогу для далейшага руху па ўсім комплексе работ, якія вядуцца па будаўніцтве АЭС. Цяпер заканчваюцца падрыхтоўчыя работы, у раёне Астраўца ствараюцца пляцоўкі, інфраструктура будучай атамнай станцыі. Ужо ў жніўні-верасні рэспубліка будзе гатовая прыступіць да земляных работ па будаўніцтве станцыі, а ў наступным годзе пачне бетонныя.

Працягваючы тэму вырашэння пытанняў энергетычнай бяспекі краіны, першы віцэ-прэм'ер праінфармаваў і пра тое, што да 2020 года ў рэспубліцы будзе пабудавана дзевяць гідраэлектрастанцый. Першая з іх будзе ўведзена ў строй ужо сёлета — гэта Гродзенская ГЭС магутнасцю 17 МВт. Вядзецца праца па падрыхтоўцы да будаўніцтва Полацкай гідраэлектрастанцыі, якую плануюць запусціць у 2014 годзе, і Віцебскай ГЭС, якую ўвядуць у строй у 2015 годзе. "Нам неабходна максімальна выкарыстоўваць тое, што краіне дадзена прыродай", — зазначыў Уладзімір Сямашка. Таму ўжо да 2015 года мяркуецца каля 28-30 працэнтаў электрычнай і цеплавой энергіі атрымліваць з мясцовых відаў паліва. Між іншым, па выніках мінулага года краіна выйшла на 20,7 працэнта.

Што датычыцца паставак расійскага газу, то, каб не ствараць сітуацый, як у 2006 годзе, партнёры ўжо цяпер вядуць перамовы аб новым кантракце на 2012—2014 гады. Пагадненне, якое было падпісана 31 снежня 2006 года, патлумачыў Уладзімір Сямашка, заканчвае сваё дзеянне 31 снежня гэтага года. Ён таксама зазначыў, што наступнае пагадненне падпісваецца на тры гады таму, што з 2015 года мяркуецца выйсці на прынцып роўнадаходнасці: апошнім прадугледжваецца, што незалежна ад краіны, куды Расія прадае энерганосьбіты, норма прыбытку ўсюды павінна быць аднолькавая. "Але гэта не значыць, што і цана будзе аднолькавай, — удакладніў першы віцэ-прэм'ер. — Для Беларусі з улікам розных фактараў (у прыватнасці, адлегласці транзіту паліва) газ будзе ў 1,2-2 разы танней, чым для іншых краін.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

**Извещение о проведении 25 апреля 2011 года открытого аукциона по продаже недвижимого имущества**

**УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»
(организатор аукциона)
повторно проводит открытый аукцион
по продаже земельного участка с кадастровым номером
623687506101000290, площадью 0,1000 га, расположенного
по адресу: Минская обл., Минский р-н, Хатежинский с/с, д. Птичь;
назначение – земельный участок для строительства
и обслуживания жилого дома.**

Начальная цена – 27 313 200 белорусских рублей.

На продаваемое имущество обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней, примененных экономических санкций.

К участию в аукционе допускаются граждане Республики Беларусь, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток в размере 2 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет № 3012104971019, в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Банк», г. Минск, код 153001369, получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Оплата объекта осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, осуществляется участником, выигравшим торги.

Аукцион состоится **25 апреля 2011 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 11.04.2011 по 21.04.2011 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефон для справок:
(017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости»
(г. Минск, ул. К. Маркса, 39).**

# «КАМУНАЛКА» СЁЛЕТА МОЖА АДРАСЦІ НА 5-7 ДОЛАРАЎ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Вось гэтыя моманты дазволяць нам неяк утаймаваць кошт квадратнага метра, хоць мы разумеем, што кошт энерганосьбітаў, паліўны складнік будзе расці. Але шэраг іншых, у тым ліку арганізацыйных упраўленчых пераўтварэнняў, якія мы намецілі, будуць дазваляць нам кантраляваць сітуацыю, каб яна была даступнай для нашых грамадзян. І ў канцы пяцігодкі мы павінны выйсці на кошт метра квадратнага роўным кошту зарплаты.

Не бачыць Анатоль Калінін асаблівых праблем у будаўнічай сферы з-за недахопу валюты ў імпарцёраў. Па яго словах, доля імпарту ў гэтай галіне не такая вялікая:

— Невысокую долю ў метры квадратным жылля складае імпартны складнік — мы пралічылі, што імпартаёмістасць у розных серыях жылых дамоў (панэльных, цагляных, маналітных) вагаецца ў межах 20-25%. У асобных будаўнічых матэрыялах (напрыклад, цэменце) яна даходзіць да 80%, бо вялікую ўдзельную вагу ў цане займаюць газ і электраэнергія. А ў сукупнасці на метр жылой плошчы — 20-25%. Таму мы менш завязаны ў будаўнічай галіне на пытаннях, якія зараз актыўна абмяркоўваюцца, — супакоіў журналістаў віцэ-прэм'ер.

### Энергаэфектыўныя дамы каштуюць даражэй, але гэта выгадна

Анатоль Калінін нагадаў, што да 2015 года доля энергаэфектыўнага жылля, што будуецца ў краіне, павінна скласці 60%. Сёння ўжо пабудаваныя некалькі такіх доследных дамоў, і іх эксплуатацыя паказвае, што яны эканомяць да 30% энергарэсурсаў.

— Мы прааналізавалі, што будаўніцтва энергаэфектыўнага дома павялічвае кошт будаўніцтва прыкладна на 80%. Затое ўсе наступныя гады эксплуатацыйныя выдаткі зніжаем на 30% — атрымліваецца акупляльнасць на працягу 1-2 гадоў, — сказаў Анатоль Калінін і дадаў, што пры такіх паказчыках ён не бачыць падстаў для нейкіх асаблівых субсідый для будучых жыхароў гэтых дамоў. — Такая эканоміка кажа сама за сябе: якія пры гэтым патрэбны льготы? Чалавек, пабудаваўшы жыллё, будзе эканоміць на ўласных камунальных паслугах увесь наступны час эксплуатацыі. Мы раней глядзелі толькі на затраты пры будаўніцтве, але ніколі не звярталі ўвагі на эксплуатацыйныя затраты. А гэта — самае важнае.

Віцэ-прэм'ер прывёў звесткі, што ў 2010 годзе ўсяго па краіне пабудавана 84,7 тысячы кватэр. У гэтым годзе запланавана 94 тысячы. З іх 55 тысяч пабудавана для тых, хто меў патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, 950 кватэр — для сацыяльнага карыстання, 4,5 тысячы — для шматдзетных сем'яў.

— Мы з 2007 года пабудавалі 268 тысяч кватэр, а на чаргу стала за гэты час 232 тысячы. І колькасць тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жылых умоў, пры сённяшняй палітыцы ў галіне будаўніцтва складана будзе забяспечыць і збалансаваць. Вось яшчэ адзін прыклад: у цэлым па рэспубліцы налічваецца 71 тысяча кватэр, у якіх не зарэгістраваны ўласнікі або члены іх сем'яў: пабудавалі і не засяліліся. 62 тысячы жыхароў маюць па дзве і больш кватэр, 26 тысяч кватэр здаецца ў наём... Дарэчы, мы разглядаем пытанне будаўніцтва арэнднага жылля: у еўрапейскіх краінах будуюць 60-80% арэнднага жылля, а ў нас жа 100% будуецца для ўласнікаў... Таму трэба пераглядаць крытэрыі, бо тыя, у каго ёсць грошы, — маюць адну і больш кватэр, а тыя, у каго няма грошай, — не маюць жылля. Дык вось мы зараз павінны разабрацца, для каго мы павінны будаваць і для каго будзе выдзяляцца дзяржаўная падтрымка. І такім чынам паспрабуем навесці ў гэтым парадак.

### Што будзе з «камуналкай»?

— У лютым было павышэнне тарыфаў для насельніцтва на 5 долараў, з якіх 4 долары — на паслугі па лініі Мінэнерга, і толькі адзін долар — на ўсе астатнія жыллёва-камунальныя паслугі. Прапрацоўваецца пытанне нязначнага, але павелічэння тарыфаў, — заявіў Анатоль Калінін. — Пытанне дастаткова далікатнае, але ў нас ёсць абгрунтаванні, каб павялічваць тарыфы для насельніцтва. Сёння яно плаціць толькі 25% ад агульнага кошту. У праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця запісана на гэты год давесці паказчык долі аплаты насельніцтвам тарыфаў ЖКГ да ўзроўню 34,5%. У любым выпадку тарыфы будуць павялічвацца, але яны будуць кантралявацца з усіх бакоў, абмяркоўвацца.

Але, па словах, Анатоля Калініна, спачатку будуць павялічаны пенсіі, а толькі потым — тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі:

— Зараз абмяркоўваецца ў Мінэканомікі і ва ўрадзе пытанне аб павышэнні спачатку пенсій, а потым тарыфаў. Я думаю, што яны вырастуць у гэтым годзе недзе на 5-7 долараў, але не выключаю, што і менш. Мы прааналізавалі, што пасля апошняга павышэння на 5 долараў у сям'і з 3 чалавек пры двух працуючых, якія атрымліваюць сярэднерэспубліканскую зарплату, камунальныя паслугі займаюць усяго 5,8% з сямейнага бюджэту. Калі ж узяць сям'ю з 3 чалавек пры двух працуючых у бюджэтнай сферы — 7,5%. Два пенсіянеры ў двухпакаёвай кватэры — 12%. Вось якраз пенсіянеры маюць патрэбу ў абароне. І мы павінны ўзмацніць адрасную сацыяльную дапамогу тым грамадзянам, у каго нізкі даход. Шэсць працэнтаў ад сямейнага бюджэту — гэта вельмі мала. Вы ж бачыце, як у Расіі, як у краінах ЕС, — плацяць і па 30%.

Таксама Анатоль Калінін расказаў яшчэ пра адну ініцыятыву, якая абмяркоўваецца ў кабінетах улады — увесці асобныя тарыфы для нарматыўнага спажывання паслуг і для пазанарматыўнага:

— Субсідыі на жыллёва-камунальныя паслугі атрымліваюць усе — і тыя, хто мае добры дастатак, і тыя, хто мае мінімальную зарплату. Намі таксама прапрацоўваецца пытанне ўвядзення двухстаўкавага тарыфу. Першая частка будзе аплачвацца за спажыванне паслугі ў межах нарматыўнага аб'ёму. А калі чалавек спажывае значна больш, то гэтая плата будзе ўзрастаць. Возьмем галіну водазабеспячэння — нарматыў быў 7,5 м³ вады на чалавека за месяц. Пры пастаноўцы прыбораў уліку мы ўбачылі, што фактычнае спажыванне ў два разы ніжэй — каля 3,5 м³ на 1 чалавека. І калі чалавек будзе спажываць больш за, скажам, 3,5 м³, то ён будзе павінен даплачваць нейкую суму.

Віцэ-прэм'ер паведаміў, што сёння дзяржава датуе сферу ЖКГ на суму каля 1,5 трлн рублёў, а перакрыжаванае субсідаванне і розная ступень пакрыцця тых ці іншых паслуг насельніцтвам не дазваляе ствараць канкурэнтнае асяроддзе ў галіне жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

### Афоню заменіць «хатні майстар»

— Штогод мы капітальна рамантуем каля 1,3 млн м². У гэтым годзе пастаўлена задача адрамантаваць капітальна 1,4 млн м². Але мы павінны рамантаваць штогод 4-5% ад усяго жылля, а мы рамантуем толькі 1,5%. Адпаведна, праблемы капітальных рамонтаў назапашваюцца. Мы тэрміны і якасць капрамонтаў жылля паставілі на кантроль, стараемся змяняць сітуацыю. А ўжо аб'ёмы патрабуюць вялікіх каласальных капіталаўкладанняў.

Таксама Анатоль Калінін бачыць шмат нараканняў у галіне ЖКГ з-за чалавечага фактару: недзе чалавеку далі адказ не ў тэрмін, недзе адмахнуліся ад праблемы. У прыватнасці, па словах віцэ-прэм'ера, укамплектаванасць рознымі кадрамі ў галіне жыллёва-камунальнай гаспадаркі складае толькі 95%, цякучасць кадраў — 14% па краіне і 18% па Мінску.

— Мы павінны распрацаваць праграму перападрыхтоўкі так званага «хатняга слесара», або «хатняга майстра». Спецыяліст будзе праходзіць адпаведнае навучанне, падрыхтоўку, будзе мець адпаведную матывацыю (узровень зарплаты). Ён будзе комплексна абслугоўваць дом або некалькі дамоў, але гэта не той Афоня, які быў, а сапраўдны спецыяліст. У Германіі такі прынцып працуе — яны абслугоўваюць болей дамоў, чым замацавана нашымі нарматыўнымі аб'ёмамі за кожным слесарам. «Хатнія майстры» будуць запатрабаваны як у дзяржаўных, так і ў прыватных арганізацыях. Яны будуць мець нейкі дыплом ці пасведчанне, што дазволіць мець добрую аплату — такі майстар і электрыку наладзіць, і сантэхніку.

Напрыканцы сустрэчы Анатоль Калінін расказаў пра лёс Міністэрства ЖКГ: яго распускаць не будуць, але функцыі дадуць іншыя:

— Мы яшчэ раз узважылі і вырашылі, што міністэрства з колькасцю 59 чалавек застанецца, але мы яго надзелім зусім іншымі функцыямі: правядзенне дзяржаўнай палітыкі, распрацоўка інавацыйных метадаў, падыходаў і тэхналогій, цэнаўтварэнне. А тыя пытанні, якія раней як быццам выконвала міністэрства (кіраванне і каардынацыя камунальных прадпрыемстваў), перададзены мясцовым органам кіравання, каб яны ў комплексе адказвалі за гэтую сферу і неслі поўную адказнасць за якасць, за тэрміны і г. д. А то часам адказнасць перакладвалася на Міністэрства ЖКГ, якое не мела рычагоў кіравання.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

### Ініцыятары «Маскоўскага механізма» АБСЕ супраць Беларусі прымяняюць непрыкрыты двайны стандарт,

які наносіць прынцыповы ўрон аўтарытэту АБСЕ. Аб гэтым гаворыцца ў выступленні Пастаяннага прадстаўніка Беларусі пры АБСЕ Аляксандра Сычова на пасяджэнні Пастаяннага савета АБСЕ. Тэкст выступлення размешчаны на сайце МЗС Беларусі, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.

«Апошнія гады на прасторы АБСЕ, у тым ліку ў краінах, дзе місіі АБСЕ адсутнічаюць, узнікалі сапраўды крызісныя сітуацыі, якія забіралі многія чалавечыя жыцці, патрабавалі самай сур'ёзнай рэакцыі. Але мы не чулі нават аб спробах задзейнічаць адпаведныя механізмы», — заявіў дыпламат.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЯПОНІЮ ЗНОЎ ТРАСЕ

Колькасць загінулых у выніку новага землятрусу на паўночным усходзе Японіі дасягнула чатырох чалавек, больш за сотню атрымалі раненні. Акрамя таго, з-за землятрусу 2,6 млн хатніх гаспадарак і службовых памяшканняў засталіся без электразабеспячэння, адзначае японскае агенцтва па надзвычайных сітуацыях. Электраэнергетычная кампанія Tohoku Electric Power Co. паведаміла, што ў выніку землятрусу адбылася ўцечка радыеактыўнай вады на АЭС «Анагава», якой гэтая кампанія кіруе.

### АПЕРАЦЫЯ ЗАХАДУ Ў ЛІВІІ МОЖА АКАЗАЦЦА БЕССЭНСОЎНАЙ

**Праз тры тыдні пасля пачатку міжнароднай ваеннай аперацыі ў Лівіі высвятляецца, што яна можа аказацца бессэнсоўнай. Супрацьстаянне сіл Кадафі і рэвалюцыйных апалчэнцаў на лівійскай зямлі зайшло ў тупік, хоць і не ўсе гэта прызнаюць.**

Ва ўсялякім разе аказалася, што нават пры падтрымцы авіяцыі заходніх саюзнікаў, якая наносіць удары па пазіцыях урадавага войска, неарганізаваныя і слаба ўзброеныя паўстанцы няздольныя, як яны збіраліся, захапіць Трыпалі і звергнуць рэжым. У гэтых умовах у НАТА, якой ад ЗША перайшло камандаванне кааліцыяй, усё часцей сталі гаварыць пра тое, што выключна сілавое рашэнне канфлікту ў гэтай краіне немагчыма.

### ДЭФІЦЫТ БЮДЖЭТУ ЗША ДАСЯГНУЎ $830 МЛРД

**Дэфіцыт федэральнага бюджэту ЗША за першыя 6 месяцаў фінансавага 2011 года дасягнуў $830 млрд, павялічыўшыся на $113 млрд у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Такія звесткі агучыла Бюджэтнае ўпраўленне кангрэса ЗША.**

У адпаведнасці з прагнозам па дынаміцы бюджэтнага дэфіцыту краіны ў 2010-2011 фінансавым годзе бюджэтны дэфіцыт складзе $1,5 трлн, ці 9,8% ад ВУП ЗША. Калі гэтая ацэнка спраўдзіцца, то Штаты зафіксуюць дэфіцыт федэральнага бюджэту вышэй за $1 трлн у трэці раз запар.

Кіраўнік Міжнароднага валютнага фонду Дамінік Строс-Кан заявіў, што амерыканская адміністрацыя павінна скараціць выдаткі бюджэту ЗША амаль на 35%, каб вярнуць бюджэт пад кантроль. Аднак, паводле меркавання аналітыкаў, гэта зусім нерэальна, паколькі выкліча неадкладны цяжкі эканамічны крызіс, што разумеюць і ў Еўропе, і ў ЗША.

### ВА УКРАІНЕ ЗАПЛАНАВАЛІ САМЫ ДАРАГІ ВАЕННЫ ПАРАД

**Міністэрства абароны Украіны збіраецца выдаткаваць на ваенны парад у гонар 20-годдзя незалежнасці Украіны больш за 320 мільёнаў грыўняў (больш за 40 мільёнаў долараў).**

Выдаткі на правядзенне параду амаль эквівалентныя, напрыклад, суме, якую ведамства разлічвала атрымаць з дзяржбюджэту на стварэнне новай ваеннай тэхнікі (350 мільёнаў грыўняў). Увесь ваенны бюджэт Украіны ў 2011 годзе склаў 11,4 мільярда грыўняў, павялічыўшыся на 30 адсоткаў у параўнанні з 2010 годам.



У 2008 і 2009 гадах ваенныя парады на Дзень незалежнасці Украіны абышліся прыкладна ў 70 мільёнаў грыўняў, а ў 2010 годзе парад увогуле не праводзіўся.

Парламенцкі дзённік

# ПРАВА НА ПРЫМУС

## Людзей з сацыяльна небяспечнымі хваробамі будуць лячыць і без іх згоды?

«Надзень шапку, а не то прастудзішся», — улюбёная мантра кожнай мамы, якая жыве крыху на поўнач ад экватара. Калі б ад усіх хвароб засцерагчыся было так проста! Ад інфекцыйных, я лічу, ніхто не застрахаваны. Можна быць тысячу разоў педантам у выкананні правілаў гігіены і не займацца незасцярожаным сэксам. Але ўсё не стэрылізуеш — не ў баракамеры жывём як-ніяк, і прэзерватывы могуць ірвацца. А сухотамі ёсць шанц заразіцца, праехаўшы з хворым у адным аўтобусе. Некаторыя немачы насамрэч уяўляюць пагрозу бяспецы насельніцтва. Беларускія заканадаўцы перагароджваюць ёй шлях сваімі метадамі.

Свежы прыклад — праект закона аб папярэджанні распаўсюджвання захворванняў, якія ўяўляюць небяспеку для здароўя насельніцтва, віруса імунадэфіцыту чалавека і гарантыях правоў грамадзян, якія маюць такія захворванні. Дакумент ужо прыняты дэпутатамі ў першым чытанні. Бадай, самая істотная навіна: ён прадугледжвае прымусовае лячэнне людзей з сацыяльна небяспечнымі хваробамі. І ім дапамога, і засцераганне іншых.

**Алена ШАМАЛЬ, дэпутат Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі**, заўважае: праект закона «балансуе паміж захаваннем здароўя нашай нацыі і дапамогай асобам, якія маюць сацыяльна небяспечныя хваробы ці ВІЧ-інфекцыю». І гэтае «ці» — вельмі істотнае. Як для юрыстаў, так і для саміх носьбітаў. Яго наяўнасць азначае, што беларускія заканадаўцы не адносяць ВІЧ да сацыяльна небяспечных хвароб. Выходзяць яны з таго, што заражэнне ім у большай ступені залежыць ад чалавека, яго ладу жыцця. У адрозненне ад тых жа сухотаў, якія перадаюцца паветрана-кропельным шляхам.

Як дакумент трактуе сацыяльна небяспечныя хваробы? Як тыя, што ўяўляюць небяспеку для здароўя насельніцтва, а іх распаўсюджванне цягне за сабой пагаршэнне здароўя нацыі, стварае пагрозу асабістай, грамадскай, нацыянальнай бяспецы. Канкрэтны пералік варта шукаць у спецыяльнай пастанове Міндароўя. Нельга сказаць, што ён будзе нязменным на стагоддзі, аднак сёння там можна знайсці актыўныя сухоты органаў дыхання з бактэрыявыдзяленнем, некаторыя венерычныя захворванні (напрыклад, сіфіліс і ганарэю), псіхічныя расстройствы, сібірскую язву, халеру, чуму ды іншыя.

Чаму ж вырашана лячыць такіх пацыентаў і без іх згоды? Давайце разбірацца, хто тут чые правы абмяжоўвае. Не будзем пра халеру і чуму, возьмем досыць распаўсюджаныя сухоты. Колькасць захварэлых за апошнія некалькі гадоў істотна вырасла, і сёння ў менш чым 10-мільённай Беларусі яна перасягае 11 тысяч. Прычым устойлівыя да лекаў формы хваробы атрымліваюць усё большую распаўсюджанасць. Як бы шырока мы ні мыслілі, ёсць усё ж вузкае разуменне сухотаў як хваробы «зэкаў», бамжоў ды іншых не самых інтэграваных у грамадства людзей. Думаеце, яны будуць старанна выконваць рэкамендацыі ўрачоў? І таблеткі не п'юць, і з бальніц уцякаюць... Іх права, здавалася б, аднак ад іх могуць пацярпець іншыя. Гэта якраз той прыклад, калі свабода аднаго чалавека заканчваецца там, дзе пачынаецца свабода іншага. Сваёй адмовай ад лячэння яны ўздзейнічаюць на іншых. Значыць, у тых павінна быць права на прымус. Я так разумею.

Прымус, прапісаны ў законапраекце, натуральна, цывілізаваны. Рашэнне аб прымусовым абследаванні, лячэнні ўрач не прымае аднаасобна.

— Толькі ўрачэбна-кансультацыйная камісія ў складзе не менш як трох медыцынскіх супрацоўнікаў, — удакладняе дэпутат.

Пасля неабходная яшчэ і санкцыя пракурора. А прымусовая шпіталізацыя (працягласцю не даўжэй за паўгода) дык наогул толькі па рашэнні суда.

Нават і такія захады, зафіксаваныя заканадаўча, будзем рэалістамі, не гарантуюць, што ўсе «ўхілісты» пралечацца. Аднак так усё адно лепш, чым без іх. Парадак прадугледжаны наступны: урачы сумесна з супрацоўнікамі органаў унутраных спраў выязджаюць да месца на медыцынскім транспарце і запрашаюць на лячэнне. Іншая справа, што «ўхілісты» робяць усё магчымае, каб іх не знайшлі. Уцякаюць, хаваюцца, даюць няправільныя адрасы...

А пакуль яны не лечацца і раз'язджаюць у грамадскім транспарце, стаяць у чэргах, бываюць у людных месцах, варта памятаць некалькі простых правіл, якія зменшаць рызыку заразіцца. Як расказала Алена Шамаль, урач па адукацыі, сухотная палачка любіць сырасць і слабасць. Адпаведна неабходна ўмацоўваць імунітэт, падсілкоўвацца вітамінамі, асабліва ў асенне-вясновую пару. Ну, і вядома ж, рупліва мыць рукі пасля транспарту, грамадскіх устаноў.

Але ж такія хворыя могуць жыць з намі па суседстве, ездзіць у тым жа ліфце, што і сотні жыхароў шматпавярховіка. Як быць тады? Ці не плануюць заканадаўцы юрыдычна аформіць адсяленне хворых на сухоты з бактэрыявыдзяленнем, якія вядуць асацыяльны лад жыцця, ухіляюцца ад лячэння?

— Сёння хворыя на сухоты маюць ільготы на атрыманне жылля. Пры разглядзе Жыллёвага кодэкса мы звярталі ўвагу калег на тое, што пажадана, каб такія асобы жылі ў маланаселеным жылым доме, — кажа дэпутат. — Трэба максімальна абмежаваць іх кантакт з людзьмі. Нам абяцалі ўлічыць гэты момант пры дапрацоўцы праекта кодэкса.

ВІЧ, які не адносяць да сацыяльна небяспечных хвароб, тым не менш, аб'яднаны з імі ў адным законапраекце. Чаму? Да гэтага заканадаўцаў падштурхоўвае трывожная статыстыка. Хворых на ВІЧ столькі ж, колькі і на сухоты. А колькасць захварэлых расце з года ў год. І калі напачатку заражаліся пераважна пры ўжыванні наркотыкаў, то цяпер адсоткаў на 70 гэта заражэнне палавым шляхам. І ўсё часцей зусім маладыя дзяўчаты і хлопцы... А хвароба гэта, як вядома, цяжка паддаецца лячэнню. Таму і імкнуцца папярэдзіць яе распаўсюджанне ўсімі магчымымі спосабамі.

— Без прафілактычных захадаў, без росту самасвядомасці людзей у гэтых пытаннях не прасунуцца наперад, — перакананая Алена Шамаль.

А пакуль жанчыны, хворыя на ВІЧ, нараджаюць дзяцей, хоць і ведаюць, на што іх асуджаюць...

Для ВІЧ прымусовай шпіталізацыі ў законе не прадугледжана. Толькі магчымасць прымусовага абследавання, калі ёсць адмова ад добраахвотнага. Па ўласнай волі яго можна прайсці і ананімна. Змушаць да абследавання будуць, калі з'явяцца дастаковыя падставы падазраваць ВІЧ. Скажам, доўга не вылечваецца пнеўманія. Ці множныя павелічэнні лімфавузлоў. Кажуць, многія даведваюцца пра ВІЧ мімаходам, звярнуўшыся па дапамогу па іншых нагодах... Прымусовае абследаванне можа чакаць і тых, хто быў з гэтым чалавекам у кантакце (а значыць, ёсць дастатковыя падставы меркаваць пра ВІЧ) і адмаўляецца ад добраахвотнага абследавання. Калі ён іх назаве, натуральна.

Праект закона выклікаў незадаволенасць грамадскіх аб'яднанняў. У прыватнасці, супольнасці людзей, якія жывуць з ВІЧ. Заканадаўцы абмеркавалі з імі іх нараканні.

— Мы стараліся пераканаць іх, што мы не ворагі, — кажа дэпутат, — і хочам пачуць ад іх не эмоцыі, а канкрэтныя прапановы, як лепш прапісаць тую ці іншую норму.

Цяпер якраз вядзецца падрыхтоўка законапраекта да другога чытання, і на гэтым этапе выказаныя заўвагі ды прапановы могуць патрапіць у тэкст дакумента.

**Ала МАЧАЛАВА.**

Дыскусійная трыбуна

# Грэчкі на наступны год можна вырасціць болей, а вось што рабіць з валютай?

**БЛІЦ-апытанне: як вы ацэньваеце эканамічную сітуацыю у краіне? Што далей рабіць з адсутнасцю валюты — аслабляць ці дэвальваваць рубель, чакаць замежнага крэдыту або нічога не рабіць?**

**Віктар МАРГЕЛАЎ, сустаршыня Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва:**

— Я лічу, што трэба зрабіць дзве рэчы: пачаць жыць па сродках і перастаць падманваць адзін аднаго. Зыходзячы з гэтага трэба правесці комплекс мерапрыемстваў па аптымізацыі эканомікі (гэта доўгая песня), і, па-другое, правесці пажадана планамернае аслабленне рубля, калі на гэта ёсць грошы. Калі няма грошай, тады, на жаль, правесці яго аднаразова. Бо негатыўныя з'явы нарастаюць не па днях, а па гадзінах. І сацыяльныя з'явы могуць быць вельмі негатыўнымі: толькі што з нашай крамы пайшоў мужчына, які 40 хвілін скандаліў, чаму яму не дасталася цукру. Мы сёння прадалі двухтыднёвую норму і цукар скончыўся. Канечне, мы прывязём новы, але самі разумееце, мы не можам працаваць у такім экстранным рэжыме, калі людзі змятаюць з паліц усё.

Калі казаць пра імпартныя тавары, то сітуацыя такая: з асобнымі з іх ёсць пытанні, але ў асноўнай масе можна казаць пра павышэнне цаны і як мінімум на 25-30%. Кожны дзень імпарцёры аб'яўляюць новыя цэны: сёння па сланечнікавым алеі цэны змяніліся тройчы за дзень. Зразумела, гэта не можа не адбіцца на цэнах на прадукты.

Ужо за мяжой наш беларускі рубель каціруецца не ніжэй за 4200. Мы павінны ўсталяваць рынкавую раўнавагу. Курс можа быць розны, бо могуць быць комплексныя мерапрыемствы. Напрыклад, як МВФ прапанаваў скараціць зарплату на 10-15% у дзяржсектары, тады ў гэтым выпадку курс мог апусціцца на 10-20%, не больш. Калі зарплату павышаць, то тады яшчэ большы курс долара будзе патрэбны да беларускага рубля.

**Аляксандр КАЛІНІН, старшыня ГА «Беларускі саюз прадпрымальнікаў»:**

— Трэба мяняць падыходы да кіравання эканомікай — адмаўляцца ад адміністрацыйнага рэгулявання эканомікай.

***— Гэта працэс складаны і працяглы, а якімі павінны быць экстранныя меры?***

— Дэвальвацыя нас не выратуе, гэта толькі на некалькі месяцаў. Але аслабленне, вядома ж, трэба праводзіць. У імпарцёраў зараз крытычная сітуацыя, шмат якія спынілі працу. Або закладваюць курс 4 тысячы.

***— Як лічыце, аслабленне павінна быць разавае ці павольнае?***

— Не, разавае нельга. Толькі паступовае.

**Георгій БАДЗЕЙ, старшыня праўлення Бізнэс-саюза прадпрымальнікаў і наймальнікаў імя прафесара М.С. Куняўскага**

— Калі няма валюты, дык хочаш не хочаш, але каб валюта з'явілася, то трэба аслабляць. Вось не было грэчкі, павысілася цана, дык хоць яна і дарагая, але можна купіць гэтую грэчку. Так і з валютай — гэта такі самы тавар, як і грэчка. І калі яе няма на рынку, то цана павінна расці... Але грэчкі на наступны сезон можна пасеяць болей і яна з'явіцца. А вось як вырасціць валюту — тут больш складаная сітуацыя. Я гэта да таго, што зрабіць аслабленне — мала, трэба зрабіць такія структурныя пераўтварэнні ў эканоміцы, каб вырасла гэтая самая валюта. Неабходна ўдасканальваць і мяняць усю структурную палітыку.

Можна падлічыць адмоўнае знешнегандлёвае сальда па мінулым годзе, яно склала недзе каля 10 мільярдаў долараў, і суаднесці з нашым экспартам. Але гэта мае ўласныя разважанні дылетанта, які не валодае лічбамі золатавалютных запасаў краіны. Можа быць у нас ёсць іншыя крыніцы. Ды яны і ёсць — трэба праводзіць прыватызацыю, трэба прыцягваць крэдыты, гэта таксама як часовае падтрыманне. Тут трэба рабіць гэта ўсё ва ўзаемнай сувязі...

***— Як пажываюць імпарцёры?***

— А справа не толькі ў іх — і экспарцёры ў дастаткова складаным стане, асабліва што тычыцца тэхпераўзбраення, закупкі абсталявання і інш. Так што тут пытанне не толькі ў імпарцёрах, гэта тычыцца ўсёй эканомікі, бо камплектуючыя, сыравіну і матэрыялы таксама трэба закупляць.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

# ЗАО «ДЕЛЬТА БАНК»

*220036, г. Минск, ул. Розы Люксембург, 95.*
*Тел. 256 19 08, www.deltabank.by*

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2011 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки / пункт Приложения № 3 к пояснительной записке | 2010 г. | 2009 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 10 498,1 | 6 790,7 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 6.3 /1 | 33 153,5 | 976,7 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 6.2 /2 | 50 148,1 | 88 828,0 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 6.4 /3 | 14 809,9 | - |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 6.1, 9 /4 | 185 380,3 | 70 270,4 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 6.7/ - | 148,0 | 1 276,5 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 6.6 /5 | 703,4 | 703,4 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 6.5 /6 | 11 142,8 | 9 387,3 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | - /7 | - | - |
| 12 | Прочие активы | 1111 | 6.8 /8 | 8 341,7 | 3 101,5 |
| 13 | ИТОГО активы | 11 | | 314 325,8 | 181 334,5 |
| 14 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 15 | Средства Национального банка | 1201 | 7.3 /9 | 17 821,2 | - |
| 16 | Средства банков | 1202 | 7.2 /10 | 35 850,7 | 12 319,0 |
| 17 | Средства клиентов | 1203 | 7.1 /11 | 168 971,3 | 100 141,8 |
| 18 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 7.4/ - | 10 113,3 | 1 884,6 |
| 19 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 7.5/ - | 840,2 | 302,0 |
| 20 | Прочие обязательства | 1206 | 7.6, 7.8 /12 | 2 739,4 | 1 570,7 |
| 21 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 236 336,1 | 116 218,1 |
| 22 | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 23 | Уставный фонд | 1211 | 11.1 /13 | 72 200,0 | 64 000,0 |
| 24 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 25 | Резервный фонд | 1213 | 11.2/ - | 739,6 | 513,8 |
| 26 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 11.3/14 | 2 001,7 | 376,8 |
| 27 | Накопленная прибыль | 1215 | 4/15 | 3 048,4 | 225,8 |
| 28 | ВСЕГО капитал | 121 | 11/ - | 77 989,7 | 65 116,4 |
| 29 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | | 314 325,8 | 181 334,5 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ за 2010 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки / пункт Приложения № 3 к пояснительной записке | 2010 г. | 2009 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 17 094,2 | 11 911,2 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 18 100,0 | 7 071,1 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 4.1/16 | (1 005,8) | 4 840,1 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 41 230,4 | 25 544,4 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 3 033,1 | 397,6 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 4.2/17 | 38 197,3 | 25 146,8 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 4.3/18 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 4.4/19 | - | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 4.5/20 | (2 261,9) | 1 237,1 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 4.6/21 | (1 370,2) | 2 462,7 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 8, 4.7/22 | 2 242,7 | 1 666,3 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | - /23 | 8 597,8 | 3 184,3 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 4.8/24 | 33 451,6 | 33 636,3 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | - /25 | 2 248,4 | 1 041,7 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 4 214,5 | 526,7 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | | 1 166,1 | 300,9 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 4/ - | 3 048,4 | 225,8 |
| | Базовая прибыль на простую акцию, руб. | | 12/ - | 18 923,94 | 1 567,97 |

## ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ КАПИТАЛА за 2010 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование показателей | Символ | Наименование статей капитала: уставный фонд | эмиссионный доход | резервный фонд | накопленная прибыль (убыток) | фонды переоценки статей баланса | всего капитал |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| | **Раздел I. За год, предшествующий отчетному** | | | | | | | |
| 1 | Остаток на 1 января 2009 года | 3011 | 64 000,0 | - | 260,0 | 253,8 | 160,8 | 64 674,6 |
| 2 | Изменения статей капитала | 3012 | - | - | 253,8 | (28,0) | 216,0 | 441,8 |
| 2.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | x | x | x | 225,8 | 216,0 | 441,8 |
| 2.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | - | - | x | - |
| 2.3 | операции с учредителями (участниками): | 30123 | - | - | x | - | x | - |
| 2.4. | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | x | x | x | - |
| 2.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | - | x | - |
| 2.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | x | x | x | x | - |
| 2.7 | перераспределение между статьями капитала | 30125 | - | - | 253,8 | (253,8) | - | - |
| 2.8 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | - | - | - |
| 3 | Остаток на 1 января 2010 года | 3013 | 64 000,0 | - | 513,8 | 225,8 | 376,8 | 65 116,4 |
| | **Раздел II. За отчетный год** | | | | | | | |
| 4 | Остаток на 1 января 2010 года | 3011 | 64 000,0 | - | 513,8 | 225,8 | 376,8 | 65 116,4 |
| 5 | Изменения статей капитала | 3012 | 8 200,0 | - | 225,8 | 2 822,6 | 1 624,9 | 12 873,3 |
| 5.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | x | x | x | 3 048,4 | 1 624,9 | 4 673,3 |
| 5.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | 225,8 | (225,8) | x | - |
| 5.3 | операции с учредителями (участниками): | 30123 | 8 200,0 | - | x | - | x | 8 200,0 |
| 5.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | 8 200,0 | - | x | x | x | 8 200,0 |
| 5.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | - | x | - |
| 5.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | x | x | x | x | - |
| 5.7 | перераспределение между статьями капитала | 30125 | - | - | - | - | - | - |
| 5.8 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | - | - | - |
| 6 | Остаток на 1 января 2011 года | 3013 | 72 200,0 | - | 739,6 | 3 048,4 | 2 001,7 | 77 989,7 |

## СВЕДЕНИЯ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ за 2010 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2010 год | 2009 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Прибыль за отчетный период | 301211 | | 3 048,4 | 225,8 |
| 2 | Прочие компоненты совокупного дохода за отчетный период | 301212 | | 1 624,9 | 216,0 |
| | В том числе: | | | | |
| 2.1 | переоценка основных средств | 3012121 | | 1 618,5 | 211,6 |
| 2.2 | переоценка незавершенного строительства и неустановленного оборудования | 3012122 | | 6,4 | 4,4 |
| 2.3 | переоценка ценных бумаг | 3012123 | | - | - |
| 2.4 | переоценка инструментов хеджирования | 3012124 | | - | - |
| 2.5 | переоценка прочих статей баланса | 3012125 | | - | - |
| 3 | ИТОГО совокупный доход за отчетный период | | | 4 673,3 | 441,8 |

## ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ за 2010 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2010 г. | 2009 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 2 | Полученные процентные доходы | 70100 | | 15 936,1 | 11 522,5 |
| 3 | Уплаченные процентные расходы | 70101 | | (18 195,4) | (5 486,5) |
| 4 | Полученные комиссионные доходы | 70102 | | 38 948,5 | 25 516,5 |
| 5 | Уплаченные комиссионные расходы | 70103 | | (2 671,1) | (388,3) |
| 6 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 70104 | | - | - |
| 7 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 70105 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 70106 | | (2 636,5) | 5 165,6 |
| 9 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 70107 | | - | - |
| 10 | Прочие полученные доходы | 70108 | | 5 347,4 | 3 064,5 |
| 11 | Прочие уплаченные расходы | 70109 | | (34 167,1) | (30 670,3) |
| 12 | Уплаченный налог на прибыль | 70110 | | (714,1) | - |
| 13 | Денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и операционных обязательствах, итого | 701 | | 1 847,8 | 8 724,0 |
| 14 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке | 70200 | | (17 499,1) | 640,7 |
| 15 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в банках | 70201 | | 1 066,4 | (47 879,4) |
| 16 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения) | 70202 | | (14 594,5) | - |
| 17 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам | 70203 | | (116 789,9) | 10 914,6 |
| 18 | Чистое снижение (прирост) денежных средств от производных финансовых активов | 70204 | | - | - |
| 19 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах | 70205 | | 15 403,4 | 1 880,5 |
| 20 | Потоки денежных средств от изменения операционных активов, итого | 702 | | (132 413,7) | (34 443,6) |
| 21 | Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка | 70300 | | 17 637,2 | - |
| 22 | Чистый прирост (снижение) денежных средств банков | 70301 | | 35 687,1 | (8 981,9) |
| 23 | Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов | 70302 | | 67 740,9 | 68 530,8 |
| 24 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком | 70303 | | 7 172,9 | 1 857,3 |
| 25 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от производных финансовых обязательств | 70304 | | - | - |
| 26 | Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах | 70305 | | (8 296,1) | (7 132,0) |
| 27 | Потоки денежных средств от изменения операционных обязательств, итого | 703 | | 119 942,0 | 54 274,2 |
| 28 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности | 70 | | (10 623,9) | 28 554,6 |
| 29 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 30 | Приобретение основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71100 | | (482,2) | (961,2) |
| 31 | Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71101 | | 91,1 | 2,2 |
| 32 | Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71102 | | - | (0,2) |
| 33 | Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71103 | | - | - |
| 34 | Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71104 | | (1 515,3) | - |
| 35 | Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71105 | | 1 525,7 | - |
| 36 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности | 71 | | (380,7) | (959,2) |
| 37 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 38 | Эмиссия акций | 72100 | | 8 200,0 | - |
| 39 | Выкуп собственных акций | 72101 | | - | - |
| 40 | Продажа ранее выкупленных собственных акций | 72102 | | - | - |
| 41 | Выплата дивидендов | 72103 | | - | - |
| 42 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности | 72 | | 8 200,0 | - |
| 43 | Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты | 73 | | (242,7) | 413,3 |
| 44 | Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов | 74 | п.13 | (3 047,3) | 28 008,7 |
| 45 | Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода | 740 | | x | 29 996,9 |
| 46 | Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода | 741 | | 26 949,6 | x |

**Председатель Правления** **А.Г. Столяров**

**Главный бухгалтер** **Е.М. Грибанова**

**Дата подписпния 15 марта 2011 года**

**Достоверность бухгалтерского баланса,
отчета о прибыли и убытках, отчета об изменении капитала,
сведений о совокупном доходе,
отчета о движении денежных средств подтверждена.**

**Заместитель директора по банковскому аудиту частного предприятия «БДО»** **Н.А. Глинков**

**28 марта 2011 года**

Лицензия НБ РБ на осуществление банковской деятельности № 27 от 01.09.2007 г. УНП 807000015

BDO

Телефон: +375 17 210 04 73
Факс: + 375 17 210 04 75
www.bdo-belarus.by

Частное предприятие «БДО»
ул. Скрыганова, 6а
помещение 14
офисное помещение 40
220073 Минск Беларусь

Акционерам и Совету директоров ЗАО «Дельта Банк»
Председателю Правления ЗАО «Дельта Банк»
г-ну Столярову Александру Геннадьевичу
ул. Р. Люксембург, 95
г. Минск
Республика Беларусь
220036
ЗАО «Дельта Банк» зарегистрировано
в Национальном банке Республики Беларусь 25.01.2001,
регистрационный номер 807000015

Исх. номер 04-03/17/617

**Аудиторское заключение по бухгалтерской (финансовой) отчетности ЗАО «Дельта Банк» за 2010 год**

Мы провели аудит прилагаемой бухгалтерской (финансовой) отчетности Закрытого акционерного общества «Дельта Банк» (далее - Банк), состоящей из бухгалтерского баланса на 1 января 2011 года, отчета о прибыли и убытках, отчета об изменении капитала и отчета о движении денежных средств за 2010 год, а также пояснительной записки.

*Ответственность руководства относительно бухгалтерской (финансовой) отчетности*

Ответственность за подготовку и объективное представление бухгалтерской (финансовой) отчетности в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь несет руководство Банка. Ответственность руководства Банка заключается в разработке, внедрении и поддержании системы внутреннего контроля, относящейся к подготовке и объективному представлению бухгалтерской (финансовой) отчетности, не содержащей существенных искажений, вызванных мошенничеством либо ошибкой; а также в выборе и применении соответствующей учетной политики и определении оценочных значений, адекватных текущим обстоятельствам.

*Ответственность аудиторов*

В наши обязанности входит выражение мнения о бухгалтерской (финансовой) отчетности на основе проведенного нами аудита, а также предоставление сведений о выполнении Банком нормативов безопасного функционирования и состоянии внутреннего контроля Банка.

Мы провели аудит в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь и Международными стандартами аудита, если они не противоречат названным требованиям. Эти стандарты и требования обязывают нас соответствовать этическим требованиям и планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить разумную уверенность в том, что бухгалтерская (финансовая) отчетность не содержит существенных искажений.

Аудит включает в себя проведение процедур для получения аудиторских доказательств по суммам и раскрытиям, представленным в бухгалтерской (финансовой) отчетности. Отбор процедур проводится на основании суждений аудитора, включающих оценку риска наличия существенных искажений в бухгалтерской (финансовой) отчетности, вне зависимости от того, явилось ли их причиной мошенничество или ошибка. При оценке данного риска аудитор рассматривает работу системы внутреннего контроля, относящуюся к подготовке и объективному представлению бухгалтерской (финансовой) отчетности Банка, в целях разработки соответствующих аудиторских процедур, но не в целях выражения мнения об эффективности работы самой системы внутреннего контроля Банка. Аудит также включает в себя оценку приемлемости используемой учетной политики, обоснованности оценочных значений, сделанных руководством Банка, и оценку общего представления бухгалтерской (финансовой) отчетности.

Мы полагаем, что полученные нами аудиторские доказательства обеспечивают достаточные и надлежащие основания для выражения нашего аудиторского мнения.

*Аудиторское мнение*

По нашему мнению, бухгалтерская (финансовая) отчетность достоверно отражает во всех существенных отношениях финансовое положение ЗАО «Дельта Банк» на 1 января 2011 года, а также результаты деятельности и движение денежных средств за 2010 год, в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь, касающимися подготовки бухгалтерской (финансовой) отчетности.

В ходе аудита нами было установлено, что Банком допускались факты несоблюдения в 2010 году нормативов безопасного функционирования, установленных Национальным банком Республики Беларусь для банков, изложенные на страницах 37, 38, 41, 44 прилагаемой отчетности. Другие факты несоблюдения Банком нормативов безопасного функционирования в 2010 году, установленных Национальным банком Республики Беларусь для банков, нами не обнаружены.

Мы также не обнаружили факты, свидетельствующие о существенном несоответствии состояния системы внутреннего контроля Банка характеру и объему осуществляемых им операций, которые могли бы привести к существенному искажению бухгалтерской (финансовой) отчетности Банка.

**Заключение по иным требованиям законодательства**

В наши обязанности также входит оценка методики расчетов и достоверности информации, включенной в формы пруденциальной отчетности 2801 «Расчет достаточности нормативного капитала», 2807 «Отчет о размере специальных резервов на покрытие возможных убытков по активам и операциям, не отраженным на балансе», 2809 «Расчет ликвидности», составленные Банком и представляемые на 1 января 2011 года. Ответственность за подготовку данных форм пруденциальной отчетности несет руководство Банка. В наши обязанности входит выражение мнения о достоверности указанных форм пруденциальной отчетности.

По нашему мнению, вышеназванные формы пруденциальной отчетности на 1 января 2011 года составлены ЗАО «Дельта Банк» достоверно во всех существенных аспектах в соответствии с Инструкцией о порядке составления и представления банками и небанковскими кредитно-финансовыми организациями пруденциальной отчетности в Национальный банк Республики Беларусь, утвержденной постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 31 октября 2006 года № 172 (с учетом дополнений и изменений).

**Глинков Николай Алексеевич**
Заместитель директора по банковскому аудиту
частного предприятия «БДО»

**Маханькова Светлана Владимировна**
Руководитель аудиторской группы
28 марта 2011 года
г. Минск, Республика Беларусь
Частное предприятие «БДО»
Свидетельство о государственной регистрации
выдано Минским горисполкомом 17.11.2010, УНП 190241132

БДО, белорусское частное предприятие, член международного объединения независимых компаний BDO. Название BDO относится к фирмам, являющимся участниками BDO International Limited, британского общества с ответственностью, ограниченной гарантией его участников. BDO – торговая марка объединения BDO и каждой компании-участницы объединения.

## Дзень войскаў проціпаветранай абароны



# НА ВАРЦЕ НЯБЕСНЫХ МЕЖАЎ



**10 красавіка адзначаецца прафесійнае свята ваенна-паветраных сіл і войскаў проціпаветранай абароны Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. На баявой варце паветранага рубяжа нашай краіны — экіпажы самалётаў і верталётаў, зенітныя ракетныя дывізіёны, радыётэхнічныя войскі. І кожны дзень на баявое дзяжурства заступаюць больш за тысячу чалавек. Святы заўсёды сустракаюць з планамі на будучыню, таму сёлета плануецца правесці больш за трыста розных па маштабе вучэнняў, трэніровак і палявых выхадаў, што дазволіць не толькі ацаніць узровень падрыхтоўкі злучэнняў і воінскіх часцей, але і дасць асабоваму складу неабходны вопыт у выкананні задач. Асноўныя ж мерапрыемствы 2011 года — удзел у сумесным аператыўным вучэнні ўзброеных сіл Беларусі і Расійскай Федэрацыі, а таксама ўдзел у кааліцыйным вучэнні дзяржаў — удзельніц СНД «Баявая садружнасць -2011» на палігоне ВС РФ «Ашулук».**

**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**



Будзь у курсе!

## РАМОНТ НА КАЛЬЦАВОЙ АДКЛАДЗЕНЫ

**На Мінскай кальцавой дарозе з 5 па 15 красавіка на ўчастку 11-15 кіламетр (раён Чыжоўкі) планавалася правесці работы па рамонце дарожнага пакрыцця левай праезнай часткі. Аднак у сувязі з неспрыяльнымі ўмовамі надвор'я яны адкладзены. Пра дакладныя тэрміны пачатку работ стане вядома пазней.**

Падчас іх правядзення, удакладняе прэс-служба дэпартамента «Белаўтадар» Мінтранса, рух па асобных палосах праезнай часткі будзе закрыты, транспартныя патокі будуць перанакіроўвацца на суседнія палосы. Таксама будзе абмежавана хуткасць руху. Падчас правядзення работ будуць арганізаваныя пастаянныя дзяжурствы дарожных службаў і ДАІ. Да ўдзельнікаў дарожнага руху агучаны зварот — быць вельмі ўважлівымі і асцярожнымі, захоўваць хуткасны рэжым і не выязджаць на палосы, дзе будуць весціся дарожныя работы.

Крымінал

## ВЫВОЗІЛІ РЫБУ І ДРАЎНІНУ

**Работнікі аператыўнага рэагавання Дзяржінспекцыі і Бярозаўскай міжрайінспекцыі пры выездзе з тэрыторыі аддзялення «Белаазёрскае» ААТ «Сялец» прыпынілі для праверкі «ВАЗ-2121» і грузавік «ГАЗ-52».**

Першым кіраваў начальнік названага аддзялення, другім — вадзіцель гэтай рыбнай гаспадаркі. Пры аглядзе ў багажніку легкавога аўтамабіля была знойдзена свежая азёрная рыба агульнай вагой 5 кілаграмаў, у кузаве грузавога — агульнай вагой каля 100 кілаграмаў. У кузаве таксама знаходзілася 12 рыбакоў з брыгады прамысловай лоўлі СВК «Спорава». Дакументаў, што пацвярджалі б законнасць валодання рыбай, ніхто прад'явіць не змог...

А на аўтадарозе Покаць — Залессе Чачэрскага раёна работнікі Гомельскай аблінспекцыі затрымалі аўтамабіль «КАМАЗ», які перавозіў дзелавую драўніну без суправаджальных дакументаў. Груз суправаджаў жыхар Бранскай вобласці Расійскай Федэрацыі, прыватны прадпрымальнік. У дзеяннях расіяніна праглядаўся састаў злачынства (крадзеж), таму выкліканыя міліцыянеры аўтамабіль з лесам даставілі на штрафстаянку Чачэрскага РАУС, у райаддзел для далейшага разбору патрапілі і індывідуальны прадпрымальнік, і вадзіцель аўтамабіля.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Супрацоўніцтва

## МАЛОЧНЫЯ БРАТЫ

**Асіповічы і Бранск падпісалі праграму доўгатэрміновага супрацоўніцтва. Сувязі будуць не толькі культурнымі і грамадскімі: абодва бакі найперш цікавіць эканоміка.**

Прадстаўніцтва беларускага зямляцтва на Браншчыне пазнаёмілася ў Асіповіцкім раёне з вытворчасцю малака на сучаснай ферме і малочных прадуктаў на мясцовым камбінаце, і першай сумеснай акцыяй у Бранску будзе знаёмства жыхароў горада з асіповіцкімі малочнымі вырабамі. Беларусы і расіяне хочуць дапамагчы адно аднаму ў паспяховым збыце патрэбнай і цікавай для суседзяў прадукцыі.

**Ілона ІВАНОВА.**

Краіна здароўя
Выпуск № 18 (254)

Вострая тэма

# Прэзумпцыя згоды дае магутны штуршок развіццю транспланталогіі

**ВЯДУЧЫЯ трансплантолагі з Беларусі, Расіі, Германіі, Польшчы, Бельгіі, Грузіі, Ізраіля, Малдовы, Казахстана, Украіны і іншых краін сабраліся днямі ў Мінску, каб узяць удзел у другой міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай актуальным пытанням трансплантацыі органаў. Адны прыехалі, каб сустрэцца са сваімі вучнямі, паколькі 28 беларускіх спецыялістаў за апошнія тры гады прайшлі стажыроўку ў вядучых еўрапейскіх і расійскіх цэнтрах трансплантацыі. Іншыя — каб набрацца досведу. І гэта чыстая праўда — беларусам ужо таксама ёсць чым пахваліцца і ёсць інфармацыя, якая можа быць цікавая для іх калег**...

— З моманту правядзення першай канферэнцыі прайшло менш за тры гады, аднак за гэты час беларускія медыкі здзейснілі сапраўдны прарыў у новай для іх галіне, — падкрэсліў у сваім выступленні **дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра трансплантацыі органаў і тканак, галоўны пазаштатны трансплантолаг Міністэрства аховы здароўя Алег РУМО.** — Развіццё транспланталогіі з'яўляецца своеасаблівым індыкатарам узроўню развіцця сістэмы аховы здароўя любой краіны. Гэта лакаматыў, які цягне за сабой усю медыцынскую галіну. Тры гады таму мы маглі толькі марыць пра тыя аперацыі, якія робім сёння. Больш за тое, многія аперацыі ўжо не проста засвоеныя — яны пастаўленыя на паток, што ставарае перадумовы для экспарту медыцынскіх паслуг.

І нават трансплантацыя сэрца ўжо перастала быць для беларусаў сенсацыяй, хоць першая аперацыя па перасадцы сэрца была здзейснена яшчэ параўнальна нядаўна — 13 лютага 2009 года. А летась было 22 такія аперацыі. Таксама за 2010 год зроблена 32 аперацыі па трансплантацыі печані і 115 аперацый па трансплантацыі нырак. Гісторыя падлетка, які атруціўся бледнай паганкай і якога выратавалі трансплантолагі, у адзін міг абляцела ўсю краіну — без донарскай печані шанцаў выжыць у хлопца не было. І гэта зусім не перабольшанне...

**Гісторыя падлетка, які атруціўся бледнай паганкай і якога выратавалі трансплантолагі, у адзін міг абляцела ўсю краіну — без донарскай печані шанцаў выжыць у хлопца не было...**

Не сакрэт, што трансплантацыя — надзвычай дарагі від дапамогі, аднак даказана, што працяглае лячэнне хворых у стацыянары абыходзіцца дзяржаве нашмат даражэй. Перасадка ныркі апраўдвае сябе ўжо на трэці год жыцця пацыента, таму што хворыя, якія знаходзяцца на гемадыялізе, да канца жыцця прыкаваныя да апарата. Лячэнне хранічнага гепатыту з перыядычнымі абвастрэннямі і трансфармацыяй у цыроз печані абыходзіцца даражэй, чым трансплантацыя печані гэтаму ж пацыенту. У рознай ступені гэта датычыцца трансплантацыі сэрца, падстраўнікавай залозы, лёгкіх і іншых органаў.

Да таго ж пасля правядзення трансплантацыі пацыенты з глыбокіх інвалідаў пераўтвараюцца ў сацыяльна актыўных членаў грамадства, здольных не толькі жыць і працаваць, але і нараджаць, і выхоўваць дзяцей. Тры пацыенткі з донарскімі ныркамі ўжо сталі шчаслівымі маці. І, самае галоўнае, для пацыентаў з тэрмінальнымі стадыямі захворвання ўнутраных органаў менавіта трансплантацыя — адзіны шанц на выратаванне. А ці мае цану выратаванае жыццё чалавека?

Па словах Алега Румо, у чэрвені 2009 года ў Беларусі была выканана першая ў краіне трансплантацыя комплексу «падстраўнікавая залоза — нырка», 19 жніўня 2010 года — першая аперацыя па лапараскапічным заборы жывой донарскай ныркі з наступнай яе трансплантацыяй сваяку. Галоўная асаблівасць такой аперацыі заключаецца ў тым, што падчас забору органа замест вялікага разрэзу пацыенту робіцца некалькі маленькіх: ад 5 міліметраў да аднаго сантыметра. Пасля такога хірургічнага ўмяшання практычна не застаецца касметычных дэфектаў, да таго ж такі спосаб дазваляе ў самыя кароткія тэрміны аднавіцца чалавеку, які ахвяраваў свой орган — ужо на трэція-чацвёртыя суткі ён можа быць выпісаны з бальніцы.

— За мінулы год у краіне было зроблена 169 аперацый па перасадцы донарскіх органаў, і пры гэтым мы згубілі толькі аднаго пацыента пасля трансплантацыі ныркі, які загінуў ад інфаркта, — паведаміў Алег Румо. — З 43 пацыентаў, якія атрымалі донарскае сэрца, жывуць 38 чалавек, выжывальнасць пацыентаў з донарскай печанню яшчэ больш высокая — звыш 90 працэнтаў. Сёння мы ганарымся тым, што кожныя тры дні пацыент з ліста чакання донарскай ныркі атрымлівае трансплантат, а тэрмін чакання ў гэтым лісце ў нас мінімальны — крыху больш за два гады. Аднак не сакрэт, што развіццё транспланталогіі магчымае толькі пры наяўнасці донарскіх органаў. Няма донарскіх органаў — няма і трансплантацый.

У Германіі, напрыклад, якая ўваходзіць у кола сусветных лідараў па колькасці ажыццёўленых трансплантацый, практычна адсутнічае ўзроставы ліміт для памерлых донараў. У Расіі таксама пашыраны ўзроставы крытэрый для донараў. Згодна з вынікамі даследавання, праведзенага групай экспертаў у ЗША, разліковая патрэба ў трансплантацыі органаў на 1 мільён насельніцтва выглядае наступным чынам: патрэба у нырках — 74,5; сэрцы — 67,4; печані — 59,1; падстраўнікавай залозе — 13,7; лёгкім — 13,7; комплекснай перасадцы сэрца і лёгкага — 18,5. Няцяжка падлічыць, што ў Беларусі з насельніцтвам каля 10 мільёнаў чалавек трэба праводзіць не менш як 500 усіх трансплантацый органаў штогод. Відавочна, што патрэба ў донарскіх органах у свеце намнога большая, чым колькасць здзейсненых перасадак. Дарэчы, у Іспаніі, якая з'яўляецца бясспрэчным сусветным лідарам па колькасці донараў і праведзеных трансплантацый, донарства разглядаецца як гуманны абавязак кожнага дарослага чалавека. Таму на дзвярах касцёлаў там нярэдка можна пабачыць зварот да прыхаджан: «Не забірайце свае органы на неба. Яны спатрэбяцца хворым людзям на зямлі».

**«На дзвярах касцёлаў у Іспаніі нярэдка можна пабачыць зварот да прыхаджан: «Не забірайце свае органы на неба. Яны спатрэбяцца хворым людзям на зямлі».**

У нашай краіне ў 2007 годзе уступіў у сілу новы Закон Рэспублікі Беларусь «Аб трансплантацыі органаў і тканак чалавека» (сёлета плануецца ўнясенне ў яго пэўных карэкціровак і дапаўненняў). У аснову закона была пакладзена прэзумпцыя згоды, якая азначае, што калі чалавек пры жыцці не выказаў свайго адмоўнага стаўлення да выкарыстання сваіх органаў пасля смерці для трансплантацыі іх хвораму чалавеку, значыць, ён дае згоду на донарства пасля сваёй смерці. Не сакрэт, што менавіта ў краінах, дзе практыкуецца мадэль прэзумпцыі згоды, актыўнасць транспланталогіі намнога вышэйшая.

— Транспланталогія — фактычна адзіная галіна ў медыцыне, якая не можа развівацца без удзелу грамадства, у прыватнасці, без яго падтрымкі, — падкрэсліў у сваім выступленні **член-карэспандэнт РАМН, дырэктар расійскага Федэральнага навуковага цэнтра транспланталогіі і штучных органаў імя акадэміка Шумакова, прафесар Сяргей ГАЦЬЕ.** — У Расіі сёлета таксама плануецца прыняць новы варыянт Закона «Аб трансплантацыі органаў і тканак чалавека», заснаваны на прэзумпцыі згоды. Будзе створаны механізм фіксацыі волевыяўлення чалавека пры яго жыцці, калі той не пажадае станавіцца донарам пасля сваёй смерці. Вельмі важна, каб грамадская думка не знаходзілася ў апазіцыі пры абмеркаванні далейшага развіцця донарства органаў і не тармазіла яго развіццё. Заўважана, што апошнім часам змяняецца псіхалагічнае стаўленне да трансплантацыі не толькі ў звычайных грамадзян, але і ў прафесіяналаў, тым ці іншым чынам звязаных з працэсам рэанімацыі, канстатацыі смерці пацыентаў і далейшым узаемадзейнічаннем з трансплантолагамі. У трансплантолагаў, якія займаюцца выратаваннем жыцця, павінна быць упэўненасць, што грамадская думка — на іх баку...

У Мінску аддзяленне па каардынацыі забору донарскіх органаў для трансплантацыі пачало дзейнічаць у красавіку 2008 года. Яго спецыялісты ажыццяўляюць кругласутачны маніторынг аддзяленняў рэанімацыі і палат інтэнсіўнай тэрапіі аддзяленняў неўралогіі ў Мінску, каб не прапусціць з'яўлення патэнцыяльнага донара. Аб эфектыўнасці яго дзейнасці можна меркаваць хоць бы па тым, што ўзровень донарства органаў у беларускай сталіцы супастаўны з паказчыкамі такіх перадавых краін, як Вялікабрытанія і Германія!

— Мы павінны істотна актывізаваць работы ў галіне донарства органаў у рэгіёнах і стварыць там паўнавартасныя аддзяленні па каардынацыі донарства, — падкрэсліў Алег Румо. — Ужо ў чэрвені гэтага года мы плануем арганізаваць першае рэгіянальнае аддзяленне па трансплантацыі ныркі ў Брэсце. І калі гэты досвед акажацца пазітыўным, то да 2015 года мы адкрыем такія аддзяленні ўжо ва ўсіх абласных цэнтрах. У 2012 годзе будзе ліквідаваны ліст чакання на донарскую нырку. Нашы кардыяхірургі ўжо практычна гатовы да трансплантацыі комплексу «сэрца—лёгкія» і трансплантацыі лёгкіх. Значыцца ў нашых планах таксама засваенне трансплантацыі комплексу «печань—нырка—падстраўнікавая залоза» і правядзенне трансплантацыі донарскага сэрца дзіцяці.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Сталасць і мудрасць

**Магілёўскія ветэраны лічаць галоўным паляпшэнне ўмоў жыцця людзей, захаванне памяці пра ахвяраў фашызму і патрыятычнае выхаванне моладзі. Такія прыярытэты ў працы вызначаны на справаздачна-выбарчай канферэнцыі Савета Магілёўскай абласной арганізацыі Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў.**

У вобласці цяпер налічваецца каля 250 тысяч удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны і ветэранаў працы. Іх грамадская арганізацыя актыўна супрацоўнічае з мясцовымі ўладамі і сацыяльнымі службамі. Гэта дапамагло асаблівую ўвагу звярнуць на бытавыя ўмовы, у якіх жывуць менавіта вясковыя ветэраны.

Зноў узначаліў абласную ветэранскую арганізацыю Анатоль Любчанка. Сёлета ветэраны будуць актыўна ўдзельнічаць у святкаванні 70-годдзя гераічнай абароны горада Магілёва.

**Ілона ІВАНОВА.**

## ОАО «Завод «Легмаш»

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС

на 1января 2011года
(в миллионах белорусских рублей)

| АКТИВ | Код стр. | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | . | | |
| первоначальная стоимость | 101 | 192007 | 199010 |
| амортизация | 102 | 163602 | 165620 |
| остаточная стоимость | 110 | 28405 | 33390 |
| Нематериальные активы | | | |
| первоначальная стоимость | 111 | 2 | 167 |
| амортизация | 112 | 1 | 15 |
| остаточная стоимость | 120 | 1 | 152 |
| Доходные вложения в материальные ценности | | | |
| первоначальная стоимость | 121 | 1358 | 1645 |
| амортизация | 122 | 328 | 477 |
| остаточная стоимость | 130 | 1030 | 1168 |
| Вложения во внеоборотные активы | 140 | 5 221 | 8773 |
| в т.ч.незавершенное строительство | 141 | 3 993 | 4783 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **34657** | **43483** |
| **II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы и затраты | 210 | 12090 | 11048 |
| В том числе: | | | |
| сырье,материалы и другие ангалогичные активы | 211 | 4833 | 4885 |
| затраты в незавершенном производстве и полуфабрикаты | 213 | 731 | 779 |
| расходы на реализацию | 214 | 4 | 6 |
| готовая продукция и товары для реализации | 215 | 6502 | 5359 |
| расходы будущих периодов | 218 | 20 | 19 |
| Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам | 220 | 6 | |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более, чем через 12 месяцев после отчетной даты) | 230 | 553 | 552 |
| В том числе: | | | |
| прочая дебиторская задолженность | 232 | 553 | 552 |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты) | 240 | 2089 | 3837 |
| В том числе: | | | |
| покупателей и заказчиков | 241 | 841 | 3040 |
| поставщиков и подрядчиков | 242 | 274 | 102 |
| по налогам и сборам | 243 | 228 | |
| разных дебиторов | 245 | 746 | 695 |
| Денежные средства | 260 | 369 | 397 |
| Финансовые вложения | 270 | 1 | 1 |
| Прочие оборотные активы | 280 | 849 | 803 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **15957** | **16638** |
| **БАЛАНС (190+290)** | **300** | **50614** | **60121** |
| **ПАССИВ** | | | |
| **III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ** | | | |
| Уставный фонд | 410 | 9 511 | 9 511 |
| Резервный фонд | 420 | 874 | 1130 |
| Добавочный фонд | 430 | 31918 | 37997 |
| Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток) | 450 | -880 | - 880 |
| Доходы будущих периодов | 470 | 369 | 367 |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **41792** | **48125** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 260 | 6714 |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **260** | **6714** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 772 | 1292 |
| Кредиторская задолженность | 620 | 7593 | 3943 |
| В том числе: | | | |
| перед поставщиками и подрядчиками | 621 | 2236 | 2953 |
| перед покупателями и заказчиками | 622 | 4753 | 70 |
| по расчетам с персоналом по оплате труда | 623 | 331 | 513 |
| по налогам и сборам | 625 | 124 | 177 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 626 | 132 | 195 |
| перед прочими кредиторами | 628 | 17 | 35 |
| Задолженность перед участниками (учредителями) | 630 | 197 | 47 |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **8562** | **5282** |
| **БАЛАНС (490+590+690)** | **700** | **50614** | **60121** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

на 1 января 2011 года
**ОАО «Завод «Легмаш»**
(в миллионах белорусских рублей)

| Наименование показателей | Код стр. | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 29413 | 23772 |
| Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | 4719 | 3766 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011) | 020 | 24694 | 20006 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 23510 | 17098 |
| Валовая прибыль (020-021-030) | 040 | 1184 | 2908 |
| Расходы на реализацию | 060 | 121 | 88 |
| ПРИБЫЛЬ(УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060) | 070 | 1063 | 2820 |
| II.ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ | | | |
| Операционные доходы | 080 | 1037 | 1009 |
| Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы | 081 | 130 | 133 |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080-081) | 090 | 907 | 876 |
| Операционные расходы | 100 | 770 | 1024 |
| ПРИБЫЛЬ(УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (090-100) | 120 | 137 | - 148 |
| III.ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ | | | |
| Внереализационные доходы | 130 | 494 | 114 |
| Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы | 131 | 1 | 5 |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131) | 140 | 493 | 109 |
| Внереализационные расходы | 150 | 775 | 791 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140-150) | 160 | - 282 | -682 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (070+120+160) | 200 | 918 | 1990 |
| Налоги на прибыль | 250 | 321 | 492 |
| Прочие налоги, сборы из прибыли | 260 | 240 | 391 |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | 270 | 57 | 39 |
| ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270) | 300 | 300 | 1068 |

**5-9. Информация о дивидендах и акциях, количестве акционеров, задолженности**

| Показатель | Единица измерения | С начала года | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров, всего | лиц | 6200 | 6200 |
| в том числе: юридических лиц | лиц | 1 | 1 |
| в том числе: физических лиц | лиц | 6199 | 6199 |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | миллионов рублей | 44 | 194 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | рублей | 0,092 | 0,407450584960 |
| Обеспеченность акции имуществом общества | тысяч рублей | 0,09 | 0,09 |
| Среднесписочная численность работающих | человек | 513 | 532 |

*УНП 300228934*

## У Вялікабрытаніі збяруць 12 тыс. малочных зубоў для помніка ствалавым клеткам

Манумент будзе выкананы ў выглядзе двухметровага палаца з каралаў. Для яго стварэння плануецца выкарыстоўваць каўчук, звонку помнік будзе пакрыты малочнымі зубамі, якіх неабходна сабраць каля 12 тыс.

Гэта ідэя належыць прафесару біялогіі Імперскага каледжа Лондана Сары Рэнкін. Паводле яе слоў, большасць людзей мяркуюць, што ствалавыя клеткі можна атрымаць выключна з эмбрыёнаў. Аднак, акрамя зародкаў, крыніцай такіх клетак могуць быць тканкі арганізма, які сфарміраваўся, у тым ліку тлушчавая, касцявы мозг, пупавіна і малочныя зубы. У сувязі з гэтым Рэнкін і Чарнецкі маюць намер пабудаваць помнік ствалавым клеткам, атрыманне якіх не звязана з разбурэннем эмбрыёнаў.

Здароўе на талерцы

# ВОТРУБ'Е: ВЫРАШЭННЕ ПЯЦІ ПРАБЛЕМ

**Ні для каго не сакрэт, што прадукты дзеляцца на карысныя і не вельмі. Напрыклад, гародніна і садавіна значна больш карысныя, чым піроЖныя і цукеркі, а хлеб з вотруб'ем лепш за звычайны. Але калі з садавінай і агароднінай усё зразумела, то ў чым заключаецца карысць славутага вотруб'я, для многіх застаецца загадкай.**

Вотруб'ем завецца тое, што звычайна ідзе ў адходы пры перамолванні збожжа ў муку. Калі не надта паглыбляцца ў батаніку, гэта ўсё, што знаходзіцца вакол крухмалістага асяродка зярняці. Вотруб'е не надта пажыўнае, аднак яно ўтрымлівае карысныя для арганізма рэчывы: клятчатку, вітаміны і мікраэлементы. Лічыцца, што ў вотруб'і змяшчаецца 90% біялагічна актыўных кампанентаў.

Нягледзячы на відавочную карысць вотруб'я, да нядаўняга часу попытам яно не карысталася і ў асноўным ішло на корм жывёле. Прычына простая: вотруб'е ў натуральным выглядзе есці немагчыма, а прыгатаваць яго смачна ніхто не ўмеў. Каму патрэбен шэры хлеб з вотруб'ем, калі можна купіць добры з мукі вышэйшага гатунку?

Усё змянілася з узнікненнем моды на здаровы лад жыцця. На парозе XXI стагоддзя людзі, стомленыя паўфабрыкатамі і фастфудам, задумаліся аб правільным харчаванні, экалагічна чыстых прадуктах і натуральных вітамінах. Менавіта тады стаў актуальным хрэстаматыйны афарызм «Я тое, што я ем», які прыпісваюць бацьку медыцыны Гіпакрату. Дарэчы, пра карысць вотруб'я для здароўя Гіпакрат таксама гаварыў.



Вытворцы прадуктаў харчавання, вырашыўшы крочыць у нагу з часам, успомнілі пра вотруб'е. Яны пачалі дадаваць яго ў ёгурты, кашы, печыва, хлеб. Ну і, вядома, вырабляць у гатовым да ўжывання выглядзе — у форме гранул. Можна проста храбусцець, а можна выкарыстоўваць у прыгатаванні карысных і нізкакаларыйных страў. У залежнасці ад перапрацаванага збожжа гранулявanae вотруб'е бывае пшанічным, жытнім, аўсяным і г.д.

### Калі вотруб'е незаменнае?

**ПРАБЛЕМА 1. Гіпавітаміноз**

Калі парушаюцца суадносіны паміж расходаваннем вітамінаў і паступленнем іх у арганізм, надыходзіць гіпавітаміноз. У залежнасці ад таго, якія вітаміны ў дэфіцыце, гіпавітаміноз можа праяўляцца ўпадкам сіл, паніжэннем імунітэту, пагаршэннем памяці, выпадзеннем валасоў, ломкасцю пазногцяў і г.д. Звычайна такі стан узнікае бліжэй да вясны, таму што прадукты, якія захоўваліся зіму, страчваюць карысныя ўласцівасці. Акрамя таго, патрэбы арганізма ў вітамінах павышаюцца пры стрэсе, курэнні, цяжарнасці, а таксама разумовых і фізічных перагрузках.

Вотруб'е змяшчае вітаміны групы В, вітамін Е і правітамін А. Менавіта таму вотруб'е такое карыснае пры гіпавітамінозе. Таксама ў ім прысутнічаюць мікраэлементы, неабходныя для нармальнага праходжання абменных працэсаў у арганізме: цынк, медзь, калій, магній.

**ПРАБЛЕМА 2. Лішняя вага**

Ёсць у чалавека лішняя вага або няма, можна даведацца, разлічыўшы яго індэкс масы цела па формуле: вагу (у кілаграмах) падзяліць на квадрат росту (у метрах). Калі вынік большы за 25 — значыць, лішняя вага ёсць. Калі ж індэкс масы цела большы за 30, то гэта ўжо атлусценне. Чым апошняе небяспечна? Пры атлусценні парушаецца абмен рэчываў, пакутуюць суставы і вены на нагах, павышаецца рызыка ўзнікнення хвароб сэрца і сасудаў.

Вотруб'е незаменнае пры лячэнні атлусцення. Усім вядома, што наядацца на ноч — шкодна для фігуры. Але калі голад не дае заснуць, не варта аб'ядацца бутэрбродамі, прыгатаванымі на хуткую руку, — лепш узяць шклянку кефіру (або абястлушчанага малака) і выпіць яго ўпрыкуску з вотруб'ем. Колькасць кілакалорый у 100 грамах вотруб'я — ад 150 да 200. Гэта больш, чым у сырой моркве, але значна менш, чым у доктарскай каўбасе. Аднак, у адрозненне ад каўбасы, вялікай пажыўнай каштоўнасці вотруб'е не мае. Іх аснова — раслінныя валокны, якія дрэнна пераўтраўліваюцца, затое хутка даюць адчуванне сыці, дзякуючы чаму чалавек доўга не адчувае голаду.

**ПРАБЛЕМА 3. Запоры**

Запор — гэта затрымка стула больш чым на 48 гадзін. Найбольш частыя прычыны запораў: дэфіцыт раслінных валокнаў у рацыёне, недастатковы прыём вадкасці, стрэсы і маларухомы лад жыцця.

Сярод харчовых прадуктаў вотруб'е займае першае месца па колькасці харчовых валокнаў (53-55%). Раслінныя валокны (клятчатка) стымулююць работу кішэчніка за кошт адсорбцыі вады. Адсорбцыя вады ў кішэчніку павялічвае аб'ём калавых мас і зніжае рызыку запораў.

**ПРАБЛЕМА 4. Захворванні сардэчна-сасудзістай сістэмы**

Навукоўцы з Гарвардскага ўніверсітэта ў Бостане даказалі, што клятчатка спрыяе паніжэнню ўзроўню халестэрыну, што дабратворна ўплывае на функцыянаванне сардэчна-сасудзістай сістэмы.

**ПРАБЛЕМА 5. Павышаны ўзровень цукру ў крыві**

Вотруб'е спрыяе падтрыманню аптымальнага ўзроўню інсуліну і цукру ў крыві. Рэч у тым, што вотруб'е засвойваецца вельмі павольна, значыць, пасля яды рэзкага скачка цукру не ўзнікае.

**УВАГА**! Ужываць вотруб'е абавязкова трэба з вадой. Інакш эфект ад яго прыёму будзе нулявы. Расказваем, як гэта рабіць правільна: вотруб'е папярэдне запарваюць кіпенем, а праз 20-30 хвілін вадкасць зліваюць. Пасля гэтага кашку можна дадаваць практычна ва ўсе стравы або ўжываць, запіваючы вадой.

Сутачная доза вотруб'я — не больш як 30 грам. Пачынаць яго ўжываць лепш па наступнай схеме: даросламу чалавеку можна есці на працягу 2 тыдняў па 1 ч. лыжцы, а затым па 1-2 ст. лыжкі 3 разы на дзень.

Каб атрымаць максімальную карысць ад вотруб'я, варта павялічыць аб'ём вадкасці, ужытай на працягу сутак, да 1,5-2 л.

Неабходна памятаць, што прыём вотруб'я пажадана не спалучаць з прыёмам полівітамінных прэпаратаў. Гэтыя рэчывы лепш падзяліць па часе. Напрыклад, вітаміны і мінералы атрымліваеце ў абед, а вотруб'е — на снеданне і вячэру. Так можна гарантаваць паступленне і ўсмоктванне карысных рэчываў у належнай колькасці.

### Вотруб'е супрацьпаказана:

- пры захворваннях страўнікава-кішачнага тракту з сіндромам дыярэі;
- пры гастрыце, язвавай хваробе страўніка і дванаццаціперснай кішкі і іншых эразіўных паражэннях СКТ у стадыі абвастрэння;
- пры спаечнай хваробе брушной поласці.

### Дарэчы

Дасведчаны касметолаг абавязкова параіць увесці ў рацыён вотруб'е для паляпшэння стану скуры, асабліва адчувальнай, схільнай да запалення і лушчэння. У хатняй касметыцы вядомыя маскі з заваранага вотруб'я з малаком — для змякчэння скуры, ліфтынгу і нават мяккага пілінгу.

**АЛАДКІ НА СНЕДАННЕ**

3 ст. лыжкі аўсянага вотруб'я заліць гарачым малаком (у колькасці, дастатковай для набракання), дадаць 1 ч. лыжку разынак, 3 здробненыя міндальныя арэхі і 3 шт. чарнасліву (таксама дробна нарэзаныя). У ахалоджаную сумесь убіць яйка, перамяшаць і выкласці на гарачую патэльню, папярэдне змазаную маслам. Падсмажыць на сярэднім агні, потым пакінуць на самым слабым агні да патрэбнага зацвярдзення, каб можна было пераварнуць, і падсмажыць з другога боку.

**КАША ГРЭЦКАЯ З ВОТРУБ'ЕМ І ЦЫБУЛЯЙ**

У рассыпістую грэцкую кашу падмешваюць пасераваную рэпчатую цыбулю і вотруб'е, падсмажанае да чырванаватага колеру. Пры падачы на стол дадаюць сметанковае масла.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.



## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ДОЛЕВОГО СТРОИТЕЛЬСТВА

«Строительство многоэтажных жилых домов по генплану №№ 11, 12, 13 в границах ул. Одоевского — ул. Бельского -ул. Пономаренко — восточная граница ландшафтно-рекреационной зоны 215 ЛР-1. Жилой дом **№ 11** по генплану».

Общество с ограниченной ответственностью «Футбольный клуб «Сквич» информирует физических и юридических лиц о создании объекта долевого строительства.

Информация о Застройщике.

ЗАСТРОЙЩИК (Заказчик) – ООО «Футбольный клуб «Сквич».

Зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 26 ноября 2004 года № 2391 в Едином государственном регистре юридических и индивидуальных предпринимателей за № 190583075.

В течение предыдущих трех лет организацией строительство не осуществлялось.

Информация о проекте.

Цель строительства – ввод в эксплуатацию жилого дома **№ 11** по г/п в составе объекта «Строительство многоэтажных жилых домов по генплану №№ 11, 12, 13 в границах ул. Одоевского — ул. Бельского — ул. Пономаренко — восточная граница ландшафтно-рекреационной зоны 215 ЛР-1».

Объект долевого строительства — многоквартирный 15-этажный крупнопанельный жилой дом (односекционный 104-квартирный жилой дом, не относящийся к домам повышенной комфортности) серии М111-90, с техническими помещениями, чердаком, высота жилых этажей — 2,6 метра. Категория комфортности по шуму – «В». Потолки — железобетонные панели. Стены и перегородки — железобетонные панели. Полы – подготовка без покрытия (железобетонная стяжка). Вентиляция жилых помещений — естественная. Отопление, электричество, водоснабжение, канализация – городские сети с индивидуальными приборами учета.

Расположен во Фрунзенском районе в г. Минске в границах ул. Одоевского — ул. Бельского — ул. Пономаренко — восточная граница ландшафтно-рекреационной зоны 215 ЛР-1.

Характеристики прилегающей территории: юг, восток, север – проектируемая и существующая многоэтажная жилая застройка; запад – парковая зона.

Секция оснащена 2 лифтами грузоподъемностью 400 кг и 630 кг и мусоропроводом.

Наружная отделка — покраска красками. На цоколе и фасадах нежилой части здания — цокольные панели с атмосфероустойчивой отделкой под покраску.

Общая площадь квартир – 5834.47 кв.м. Всего квартир – 104 (сто четыре).

Для привлечения физических лиц, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей предлагаются к строительству по договорам создания объекта долевого строительства 10 (Десять) квартир, из них:

— однокомнатные — максимальной общей площадью 45,11 кв.м стоимостью 3 800 000 белорусских рублей за 1 кв. м – 5 (пять) квартир;

— двухкомнатные — максимальной общей площадью 60,58 кв.м стоимостью 3 800 000 белорусских рублей за 1 кв. м – 5 (пять) квартир.

Отделка квартир не выполняется.

Все квартиры имеют летние помещения (лоджии).

Межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические помещения и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в общую собственность дольщиков.

Элементы благоустройства:

— на цоколе и фасадах нежилой части здания – атмосфероустойчивая отделка под покраску;

— на фасадах — освещение (подсветка) фасадов, выходящих на улицу— Проектируемую, 1;

— благоустройство включает дворовую территорию с расположением детской, бельевой и хозяйственной площадок; озеленение территории, предусмотрено устройство тротуаров, дорожек;

— автостоянка на 150 машиномест.

Застройщиком получены:

— акт выбора места размещения земельного участка на 2,4398 га, утвержденного 16 декабря 2008 года Председателем Минского городского исполнительного комитета;

— решение на строительство Минского городского исполнительного комитета № 2237 от 30.09.2010 г.;

— проектно-сметная документация, прошедшая в установленном порядке государственную экспертизу, заключение РУП «ГОССТРОЙЭКСПЕРТИЗА по г. Минску» № 615-60/10 от 13.07.2010 г.;

— договор строительного подряда № 5-Ф от 6.09.2010 г. с ОАО «МАПИД», лицензия № 02250/0589508, выданная 26.02.2001 г.;

— выданное органом государственного строительного надзора разрешение на производство строительно-монтажных работ № 2-208Ж-112/10 от 20.10.2010 г.

Начало строительства – IV квартал 2010 года.

Срок окончания строительства – IV квартал 2011 года.

Указанные в настоящей проектной декларации цены на соответствующее количество объектов долевого строительства считать действительными до момента опубликования новой проектной декларации.

Подробные сведения об объекте долевого строительства и условия заключения договоров на строительство можно получить по адресу: 220092, г. Минск, пр. Пушкина, 39, офис 6, тел. для справок: 8 029 605 09 09, 257 74 16, 257 30 61. Режим работы: понедельник-пятница с 08:30 до 17:30, обед: с 13:00 до 14:00, выходные дни – суббота, воскресенье.

## Усходні гараскоп на наступны тыдзень

# Цяльцам будзе шанцаваць, і Скарпіёны таксама атрымаюць свой шанц

**АВЕН**. Можна чакаць павышэння па службе. Аддача ў справах будзе знаходзіцца ў прамой залежнасці ад прыкладзеных намаганняў. Загадзя складзены дакладны план дзеянняў дапаможа пазбегнуць мітусні. Значную дапамогу па многіх пытаннях акажуць заступнікі, калі такія ў вас ёсць, і гэта будзе вельмі дарэчы. Паспрабуйце, каб захопленасць працай не паўплывала на адносіны ў сям'і і родныя не адчулі сябе абдзеленымі вашай увагай. Нядзелю прысвяціце вырашэнню бытавых праблем.

**ЦЯЛЕЦ**. Будзе шанцаваць. Прычым як у гульні, так і ў каханні, як бы парадаксальна гэта ні было. Праўда, гульня павінна быць не азартная, а акцёрская — тут ваш поспех будзе вышэйшы за ўсе чаканні. Можаце дазволіць сабе нават самыя экстравагантныя выхадкі — яны будуць сустрэтыя з захапленнем. Такая спрыяльная сітуацыя складаецца нячаста, таму правядзіце гэты час максімальна прыемным для вас чынам. Блізкія людзі прынясуць радасць. У канцы тыдня верагодная плённая сустрэча ў нефармальнай абстаноўцы або ўдалая паездка.

**БЛІЗНЯТЫ**. Надыходзіць тыдзень сур'ёзных змен, таму імкніцеся паводзіць сябе як мага больш актыўна. Збірайце інфармацыю аб тым, што адбываецца. На сваім працоўным месцы імкніцеся дасягнуць вяршыняў прафесіяналізму. Праяўляючы лепшыя якасці сваёй асобы, дапамагаючы навакольным, убачыце, як узрасце ваш аўтарытэт, і тады людзі пацягнуцца да вас.

**РАК**. Зможаце досыць лёгка разабрацца са справамі, прычым вашы дасягненні не будуць залежаць ад характару гэтых спраў. З'явіцца магчымасць перагледзець свой статус і яшчэ раз абгаварыць гэта з зацікаўленымі людзьмі — зрэшты, тут ад вас запатрабуюцца дадатковыя намаганні. Магчымыя цікавыя прапановы, з-за якіх давядзецца прымаць нестандартныя рашэнні і пазбаўляцца ад напрацаваных звычак. У другой палове тыдня трэба будзе ўзяць на сябе адказнасць за прыняцце рашэнняў, якія паўплываюць на бліжэйшую будучыню.

**ЛЕЎ**. Раптам захочацца знайсці новых дзелавых партнёраў, ярка праявіць сябе на працы, але глабальных вынікаў такія душэўныя парывы не абяцаюць. Здольнасць заўважаць драбнюткія дэталі спадабаецца начальству, і толькі лянота можа перашкодзіць у развіцці кар'еры, так што варта своечасова ўзяць сябе ў рукі. У першай палове тыдня з'явіцца магчымасць завесці карысныя сувязі, якія вельмі спатрэбяцца ў бліжэйшай будучыні.

**ДЗЕВА**. Тыдзень можа запатрабаваць мінімальнага напружання, і то — толькі ў той момант, калі трэба будзе проста не выпусціць шанц, які атрымалі. Чакаюцца пазітыўныя змены на прафесійнай ніве, калі не забудзецеся: там, дзе няма прамога рашэння, як правіла, дапамагаюць дыпламатыя і гатоўнасць да кампрамісу.

**ШАЛІ**. Будзеце выпраменьваць аптымізм на працягу ўсяго тыдня і гэтым прыцягваць навакольных. Звярніце належную ўвагу на дзелавыя сустрэчы і вядзенне перамоў. У панядзелак або аўторак верагодныя важныя званкі, паспрабуйце іх не прапусціць. Пажадана цяпер адмовіцца ад рызыкоўных або авантурных прапаноў. З наватарскімі ідэямі лепш пачакаць. Другую палову тыдня прысвяціце дому і адпачынку. Не забывайцеся пра сваякоў: своечасовы візіт прыйдзецца ім па душы і можа нечакана вырашыць нейкую праблему.

**СКАРПІЁН**. Зможаце падвесці вынік, хай сабе і прамежкавы, у адной з галін сваёй дзейнасці. А можа быць, вас настойліва папросяць гэта зрабіць. Лёс падорыць шанц: верагодна, гэта будзе новая праца або магчымасць змяніць месца жыхарства. У любым выпадку вы набудзеце нешта каштоўнае для сябе.

**СТРАЛЕЦ**. Можаце адчуць настальгію. Толькі паспрабуйце не паддавацца засмучэнню. Што можа прыемна здзівіць — дык гэта магчымасць зарабіць або памяняць працу на больш высокааплатную. Будзьце смялейшымі ў зносінах з тымі, хто прычыняе вам усякія непрыемнасці. Час пазбавіцца сумневаў і няўпэўненасці і смела прасоўвацца да пастаўленай мэты.

**КАЗЯРОГ**. Найбольш заўважных вынікаў атрымаецца дасягнуць у самаўдасканаленні. Калі няма ні часу, ні жадання ўдасканальвацца духоўна, займіцеся самаадукацыяй. Хоць бы па асноўным профілі прафесійнай дзейнасці. Па меры сіл пазбягайце сварак з роднымі, хоць гэта будзе і няпроста. Не прымаць удзелу ў канфліктах дапамогуць мудрасць і падатлівасць. Праўда, зараз будзе цяжка іх праявіць. Стары сябар пазбавіць ад перашкод у кар'еры. Сваякі могуць стаць прычынай неспадзяваных падзей.

**ВАДАЛЕЙ**. Будзе шмат зносін, але паспрабуйце пры гэтым не пасварыцца і публічна не высвятляць адносіны. Будзеце разрывацца паміж прафесійнымі абавязкамі і сямейнымі справамі. Калегі могуць плесці супраць вас сетку інтрыг — не варта даваць ім падставы даць вам падножку. Пажадана нікуды не спазняцца, бо з падобных дробязяў на гэтым тыдні можа складацца ваша рэпутацыя.

**РЫБЫ**. Думкі будуць занятыя чым заўгодна, але толькі не службовымі рэчамі. Могуць вярнуцца старыя нявырашаныя праблемы, таму надайце асаблівую ўвагу дробязям. Нават калі дапусціце нязначную памылку, за сваё службовае становішча можаце не хвалявацца. У чацвер усё можа літаральна валіцца з рук. Не хвалюйцеся — проста гэта не ваш дзень. Давядзецца разлічваць толькі на свае сілы і магчымасці, а дапамога збоку можа апынуцца мядзведжай паслугай.

## ФЭН-ШУЙ ГАРАСКОП

### Нядзеля, 10 красавіка

Да гармоніі ў адносінах з навакольнымі будзе даволі далёка. Але і правароніць што-небудзь з-за бестурботнасці і недахопу сабранасці можна будзе толькі пры вялікім адпаведным жаданні. Паспрабуйце не перагружацца і ўсё ж такі асноўны ўпор зрабіць на папаўненні запасаў маральных і фізічных сіл.

### Панядзелак, 11 красавіка

Сёння пажадана максімальна мабілізавацца і быць гатовымі да любых нечаканасцяў — гэта па-першае, а па-другое, не спяшайцеся са свежымі ініцыятывамі і не хапайцеся за пытанні, якія пакуль могуць апынуцца не па зубах. Трэба адшукваць унутраныя рэзервы або наадварот, расслабіцца і не пялегаваць напалеонаўскіх планаў.

### Аўторак, 12 красавіка

Нядрэнны час для працы галавой, пошуку пунктаў сутыкнення і канструктыўнага ўзаемадзеяння з навакольнымі, абмеркавання, атрымання і перадачы інфармацыі, аднак спяшацца не варта, бо сённяшнія дасягненні заўтра могуць апынуцца «сырымі» і запатрабуюць «дапрацоўкі напільнікам», а то і поўнага перараблівання.

### Серада, 13 красавіка

Добры час для працы з інфармацыяй, прадуктыўнага ўзаемадзеяння з калегамі і партнёрамі, і няхай традыцыйны пабочны эфект — маса лішніх рухаў і мітусні — таксама нікуды не дзенецца, гэтая плата не выглядае празмернай. Вынаходлівасць і рухомасць дапамогуць знайсці свой падыход да любой праблемы, а напружанне патрапіць не толькі ў пасіў: няўстойлівы фон і больш вострыя рэакцыі могуць падштурхнуць да рашучых дзеянняў без лішняга разварушвання.

### Чацвер, 14 красавіка

Першая частка дня абяцае вельмі сціплыя далягляды на ўсіх кірунках, а агульны занадта спакойны фон наўрад ці падтрымае спробы разагнацца самому або расштурхаць іншых. У адносінах і асабліва практычных пытаннях месцамі давядзецца ісці навобмацак. Другая палова дня будзе адчувальна весялейшай і больш актыўнай. Мусіць, сёння лепш, як у мультфільме: дзень страціць, але потым за гадзіну даляцець.

### Пятніца, 15 красавіка

Дзень не асабліва выклікае схільнасць да актыўнага ўздзеяння на працэсы любога характару і ступені складанасці. Прынамсі, колькасць перашкод на шляху да вяршыняў прымусіць задумацца аб мэтазгоднасці прамой дарогі з лабавымі атакамі. Праблемы з пошукам агульнай мовы з навакольнымі могуць забяспечыць нас больш вострымі праблемамі. Мабыць, гэтую буру лепш перасядзець ціха!

### Субота, 16 красавіка

Дынамічны, дзейны дзень, які выклікае прыхільнасць да актыўнай лініі паводзін. Магчыма, рэкордаў у сабранасці і мэтанакіраванасці паставіць не атрымаецца. Зрэшты, у дэфіцыце будзе ў першую чаргу жаданне і настрой, так што, калі каму атрымаецца прыпасці да адпаведнай крыніцы — вынікі, як мінімум, не засмуцяць. Добры час для спакойнага і планамернага руху на ўсіх франтах, а таксама адпачынку і блізкіх зносін.



## БЕЗГАСПАДАРНЫ КАНЬЯК

У скрыні для інвентара непрацоўнага тамбура вагона-рэстарана пасажырскага цягніка «Кішынёў—Санкт-Пецярбург» гомельскія памежнікі сумесна з мытнікамі знайшлі 30 бутэлек каньяку «Квінт». Малдаўскі праваднік не змог растлумачыць, каму належыць вадкі груз, ацэнены ў Br1,2 млн. Рэчы, гаспадары якіх таксама засталіся невядомымі, знойдзены і ў раёне пункта пропуску Новая Рудня ў лясным масіве, паведаміў начальнік прэс-службы гомельскай памежнай групы Дзмітрый Уклейка. Увагу службовага сабакі памежнікаў прыцягнулі чатыры пакеты, набітыя штучнымі кветкамі і розным адзеннем у колькасці больш чым 150 адзінак.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ЖАНЧЫНА І ДЗІЦЯ ВЫРАТАВАЛІСЯ

У ноч з 7 на 8 красавіка ў вёсцы Іванаўка Бабруйскага раёна адбыўся пажар. Напярэдадні 38-гадовы сужыцель гаспадыні вярнуўся дадому і лёг спаць, верагодна, з запаленай цыгарэтай у руках. Каля 3 гадзін уначы людзей пабудзіў рэзкі гук аўтаномнага пажарнага апавяшчальніка, які спрацаваў на задымленне. Не губляючы часу, 25-гадовая жанчына схапіла 6-гадовую дачку і выбегла на вуліцу. Мужчына таксама выбег, але вырашыў вярнуцца па дакументы. Як паведамілі ў Магілёўскім УМНС, яго без прыкмет жыцця знайшлі выратавальнікі, якія прыбылі на тушэнне пажару.

**Ілона ІВАНОВА.**

**Утерянные страховые полисы** ЗСАО «БелИнгострах» добровольного страхования от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2 РН, 2 РП серии ИС №№ 0352565, 0388840, 0391864 **считать недействительными**.

УНП 100219645

# Закрытое акционерное общество «Сомбелбанк»

Республика Беларусь, 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, д. 25
Телефоны: 328 65 82, 328 65 69

сомбелбанк
УСПЕХ – ЭТО ТОЛЬКО НАЧАЛО

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2011 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2010 г. | 2009 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | АКТИВЫ | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 5.2. | 17 598,7 | 11 309,3 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 5.3. | 36 421,2 | 5 455,9 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 5.4. | 2 660,5 | 12 919,3 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | - | - |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 5.5. | 141 482,6 | 64 678,5 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 5.6. | 0,1 | 115,1 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 5.7. | 4 370,5 | 1 992,5 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 5.8. | 138,0 | 167,8 |
| 12 | Прочие активы | 1111 | 5.9. | 6 633,2 | 1 341,5 |
| 13 | ИТОГО активы | 11 | | 209 304,8 | 97 979,9 |
| 14 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | | |
| 15 | Средства Национального банка | 1201 | 5.10. | 28 074,5 | - |
| 16 | Средства банков | 1202 | 5.11. | 8 710,2 | 143,6 |
| 17 | Средства клиентов | 1203 | 5.12. | 93 061,7 | 50 442,0 |
| 18 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | - | - |
| 19 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 5.13. | 3,4 | 61,2 |
| 20 | Прочие обязательства | 1206 | 5.14. | 2 172,4 | 1 136,1 |
| 21 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 132 022,2 | 51 782,9 |
| 22 | КАПИТАЛ | | | | |
| 23 | Уставный фонд | 1211 | 14.3 | 55 322,6 | 35 589,1 |
| 24 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 25 | Резервный фонд | 1213 | 14.9 | 10 332,2 | 5 122,9 |
| 26 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 14.10 | 567,7 | 275,7 |
| 27 | Накопленная прибыль | 1215 | | 11 060,1 | 5 209,3 |
| 28 | ВСЕГО капитал | 121 | | 77 282,6 | 46 197,0 |
| 29 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | | 209 304,8 | 97 979,9 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ за 2010 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2010 год | 2009 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 6.2. | 13 509,8 | 10 149,3 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 6.2. | 7 821,8 | 5 472,2 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 6.2. | 5 688,0 | 4 677,1 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 6.3. | 28 778,0 | 13 860,8 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 6.3. | 2 719,8 | 1 044,5 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 6.3. | 26 058,2 | 12 816,3 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 6.4. | (0,8) | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 6.5. | 3 874,4 | 2 202,5 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 6.6. | 82,6 | 733,2 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 6.7. | 3 098,1 | 2 270,3 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 6.8. | 3 338,9 | 583,8 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 6.9. | 19 830,2 | 10 772,8 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 6.10. | 1 310,6 | 1 019,3 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 14 802,4 | 6 950,5 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | | 3 742,3 | 1 741,2 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 11 060,1 | 5 209,3 |
| 18 | Базовая прибыль на простую акцию | | | 874 515,08 | 483 910,82 |
| 19 | Разводненная прибыль на простую акцию | | | 874 515,08 | 483 910,82 |

## ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ КАПИТАЛА за 2010 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование показателей | Символ | Наименование статей капитала: уставный фонд | эмиссионный доход | резервный фонд | накопленная прибыль (убыток) | фонды переоценки статей баланса | всего капитал |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| | Раздел I. За год, предшествующий отчетному | | | | | | | |
| 1 | Остаток на 1 января 2009 г. | 3011 | 35 589,1 | - | 2 419,1 | 2 703,8 | 138,7 | 40 850,7 |
| 2 | Изменения статей капитала | 3012 | - | - | 2 703,8 | 2 505,5 | 137,0 | 5 346,3 |
| 2.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | x | x | x | 5 209,3 | 137,0 | 5 346,3 |
| 2.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | 2 703,8 | (2 703,8) | x | - |
| 2.3 | операции с учредителями (участниками) | 30123 | - | - | x | - | x | - |
| 2.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | x | x | x | - |
| 2.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | - | x | - |
| 2.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | x | x | x | x | - |
| 2.7 | перераспределение между статьями капитала | 30125 | - | - | - | - | - | - |
| 2.8 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | - | - | - |
| 3 | Остаток на 1 января 2010 г. | 3013 | 35 589,1 | - | 5 122,9 | 5 209,3 | 275,7 | 46 197,0 |
| | Раздел II. За отчетный год | | | | | | | |
| 4 | Остаток на 1 января 2010 г. | 3011 | 35 589,1 | - | 5 122,9 | 5 209,3 | 275,7 | 46 197,0 |
| 5 | Изменения статей капитала | 3012 | 19 733,5 | - | 5 209,3 | 5 850,8 | 292,0 | 31 085,6 |
| 5.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | x | x | x | 11 060,1 | 292,0 | 11 352,1 |
| 5.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | 5 209,3 | (5 209,3) | x | - |
| 5.3 | операции с учредителями (участниками) | 30123 | 19 733,5 | - | x | - | x | 19 733,5 |
| 5.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | 19 733,5 | - | x | x | x | 19 733,5 |
| 5.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | - | x | - |
| 5.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | x | x | x | x | - |
| 5.7 | перераспределение между статьями капитала | 30125 | - | - | - | - | - | - |
| 5.8 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | - | - | - |
| 6 | Остаток на 1 января 2011 г. | 3013 | 55 322,6 | - | 10 332,2 | 11 060,1 | 567,7 | 77 282,6 |

## СВЕДЕНИЯ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ за 2010 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2010 г. | 2009 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Прибыль (убыток) за отчетный период | 301211 | | 11 060,1 | 5 209,3 |
| 2 | Прочие компоненты совокупного дохода за отчетный период | 301212 | | 292,0 | 137,0 |
| 2.1 | В том числе: переоценка основных средств | 3012121 | | 291,7 | 137,0 |
| 2.2 | переоценка незавершенного строительства и неустановленного оборудования | 3012122 | | 0,3 | - |
| 2.3 | переоценка ценных бумаг | 3012123 | | - | - |
| 2.4 | переоценка инструментов хеджирования | 3012124 | | - | - |
| 2.5 | переоценка прочих статей баланса | 3012125 | | - | - |
| 3 | ИТОГО совокупный доход за отчетный период | 30121 | | 11 352,1 | 5 346,3 |

## ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ за 2010 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2010 год | 2009 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ | | | | |
| 2 | Полученные процентные доходы | 70100 | | 12 866,9 | 10 142,8 |
| 3 | Уплаченные процентные расходы | 70101 | | 7 477,1 | 5 554,8 |
| 4 | Полученные комиссионные доходы | 70102 | | 27 540,0 | 13 857,8 |
| 5 | Уплаченные комиссионные расходы | 70103 | | 2 473,1 | 984,2 |
| 6 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 70104 | | - | - |
| 7 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 70105 | | (0,8) | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 70106 | | 3 387,5 | 1 685,4 |
| 9 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 70107 | | 82,6 | 733,2 |
| 10 | Прочие полученные доходы | 70108 | | 1 558,6 | 1 870,0 |
| 11 | Прочие уплаченные расходы | 70109 | | 19 914,4 | 11 799,3 |
| 12 | Уплаченный налог на прибыль | 70110 | | 3 748,8 | 1 469,0 |
| 13 | Денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и операционных обязательствах - итого | 701 | | 11 821,4 | 8 481,9 |
| 14 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке | 70200 | | (27 210,1) | 296,6 |
| 15 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в банках | 70201 | | 7 935,5 | (7 198,6) |
| 16 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения) | 70202 | | - | 2 940,6 |
| 17 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам | 70203 | | (77 529,3) | (7 003,1) |
| 18 | Чистое снижение (прирост) денежных средств от производных финансовых активов | 70204 | | 115,0 | (98,0) |
| 19 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах | 70205 | | (6 989,8) | 913,1 |
| 20 | Потоки денежных средств от изменения операционных активов - итого | 702 | | (103 678,7) | (10 149,4) |
| 21 | Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка | 70300 | | 27 979,8 | - |
| 22 | Чистый прирост (снижение) денежных средств банков | 70301 | | 8 554,8 | (500,5) |
| 23 | Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов | 70302 | | 42 019,6 | 8 192,6 |
| 24 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком | 70303 | | - | - |
| 25 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от производных финансовых обязательств | 70304 | | (57,8) | 48,3 |
| 26 | Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах | 70305 | | 2 356,7 | (1 469,7) |
| 27 | Потоки денежных средств от изменения операционных обязательств - итого | 703 | | 80 853,1 | 6 270,7 |
| 28 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности | 70 | 18.2 | (11 004,2) | 4 603,2 |
| 29 | ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ | | | | |
| 30 | Приобретение основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71100 | | (2 586,4) | (289,6) |
| 31 | Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71101 | | 3,6 | 7,0 |
| 32 | Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71102 | | - | - |
| 33 | Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71103 | | - | - |
| 34 | Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71104 | | (39 704,6) | - |
| 35 | Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71105 | | 39 704,6 | - |
| 36 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности | 71 | 18.2 | (2 582,8) | (282,6) |
| 37 | ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ | | | | |
| 38 | Эмиссия акций | 72100 | | 19 733,5 | - |
| 39 | Выкуп собственных акций | 72101 | | - | - |
| 40 | Продажа ранее выкупленных собственных акций | 72102 | | - | - |
| 41 | Выплата дивидендов | 72103 | | - | - |
| 42 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности | 72 | 18.2 | 19 733,5 | - |
| 43 | Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты | 73 | | 806,5 | 2 130,1 |
| 44 | Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов | 74 | | 6 953,0 | 6 450,7 |
| 45 | Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода | 740 | | 18 247,5 | 11 796,8 |
| 46 | Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода | 741 | | 25 200,5 | 18 247,5 |

**Руководитель** **Т.М. Медведева**

**Главный бухгалтер** **Е.М. Папушева**

**Дата подписания 25 марта 2011 г.**

ЗАО «Сомбелбанк», лицензия № 25 от 13.11.2008 г., выдана НБ РБ, УНП 807000122.

ERNST & YOUNG

**Ernst & Young LLC**
Korol Street, 51, 2nd floor, offic 30
Minsk, 220004, Republic of Belarus

Tel: +375 (17) 209 4535
Fax: +375 (17) 209 4534
www.ey.com/belarus

**ИООО «Эрнст энд Янг»**
Республика Беларусь, 220004, Минск
ул. Короля, 51, 2 этаж, офис 30

Тел.: +375 (17) 209 4535
Факс: +375 (17) 209 4534

### АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ
**независимой Аудиторской организации ИООО «Эрнст энд Янг» по финансовой отчетности, состоящей из годового отчета ЗАО «Сомбелбанк» и годовых отчетных форм о соблюдении пруденциальных норм, подготовленных по итогам деятельности за 2010 год**

Акционерам, Совету директоров и Правлению ЗАО «Сомбелбанк»
Национальному банку Республики Беларусь

Мы провели аудит прилагаемой финансовой отчетности, состоящей из годового отчета Банка за период с 1 января по 31 декабря 2010 года включительно и годовых отчетных форм о соблюдении пруденциальных норм по состоянию на 1 января 2011 года.

В соответствии с «Инструкцией по составлению годового отчета банками Республики Беларусь», утвержденной постановлением Совета директоров Национального банка Республики Беларусь от 27 ноября 2006 года № 323 с последующими изменениями и дополнениями, годовой отчет Банка состоит из:

- Бухгалтерского баланса Банка на 1 января 2011 года (Форма 1);
- Отчета о прибыли и убытках Банка за 2010 год (Форма 2);
- Отчета об изменении капитала Банка за 2010 год (Форма 3);
- Отчета о движении денежных средств Банка за 2010 год (Форма 4);
- Пояснительной записки.

Аудит информации, изложенной в пояснительной записке к годовому отчету Банка за 2010 год, проводился только в отношении пунктов: 1-12, 14-18.

Указанный годовой отчет был подготовлен руководством Банка в соответствии с Законом Республики Беларусь от 18 октября 1994 года № 3321-XII «О бухгалтерском учете и отчетности», «Инструкцией по ведению бухгалтерского учета в банках, расположенных на территории Республики Беларусь», утвержденной постановлением Совета директоров Национального банка Республики Беларусь от 19 сентября 2005 года № 283 с изменениями и дополнениями, «Инструкцией по составлению годового отчета банками Республики Беларусь», утвержденной постановлением Совета директоров Национального банка Республики Беларусь от 27 ноября 2006 года № 323 с изменениями и дополнениями, и другими нормативными правовыми актами Национального банка Республики Беларусь, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и подготовки финансовой отчетности для банков Республики Беларусь и действовавшими в отчетном периоде.

Годовые отчетные формы о соблюдении пруденциальных норм подготовлены руководством Банка на основе указанного выше годового отчета. В соответствии с «Инструкцией о порядке составления и представления банками и небанковскими кредитно-финансовыми организациями пруденциальной отчетности в Национальный банк Республики Беларусь», утвержденной Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 31 октября 2006 года № 172, годовые отчетные формы Банка о соблюдении пруденциальных норм состоят из:

- Формы 2801 «Расчет достаточности нормативного капитала»;
- Формы 2807 «Отчет о размере специальных резервов на покрытие возможных убытков по активам и операциям, не отраженным на балансе»;
- Формы 2809 «Расчет ликвидности».

*Ответственность руководства*

Ответственность за подготовку и представление данных годового отчета, прилагаемого на 76 листах, и годовых отчетных форм о соблюдении пруденциальных норм, прилагаемых на 14 листах, (далее «финансовая отчетность») несет руководство Банка. Данная ответственность распространяется на разработку, внедрение и поддержание надлежащего функционирования системы внутреннего контроля, которая должна обеспечивать подготовку достоверной финансовой отчетности, не содержащей существенных искажений в результате ошибок или недобросовестных действий; выбор и применение надлежащей учетной политики, а также обоснованных оценочных значений.

*Ответственность Аудиторской организации и описание аудита*

Наша обязанность заключается в том, чтобы на основе проведенного аудита выразить мнение о достоверности данной финансовой отчетности во всех существенных отношениях.

Мы руководствовались требованиями Закона Республики Беларусь «Об аудиторской деятельности» от 8 ноября 1994 года № 3373-XII и провели аудит в соответствии с Правилами аудиторской деятельности, утвержденными Министерством финансов Республики Беларусь. Данные правила обязывают нас соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия либо отсутствия существенных искажений в представленной финансовой отчетности.

В ходе аудита нами были выполнены аудиторские процедуры для получения аудиторских доказательств, подтверждающих значения и раскрытия информации в финансовой отчетности. Отбор аудиторских процедур осуществлялся на основании профессионального суждения с учетом оценки риска существенного искажения финансовой отчетности в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке риска существенного искажения финансовой отчетности нами рассматривалась система внутреннего контроля Банка с целью планирования дальнейших аудиторских процедур в зависимости от оцененных рисков, а не для выражения мнения относительно эффективности функционирования этой системы. Аудит также включал оценку правомерности применяемой учетной политики, обоснованности оценочных значений и общего представления финансовой отчетности.

Мы считаем, что в ходе аудита нами были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения.

*Мнение*

По нашему мнению, указанная выше финансовая отчетность, состоящая из годового отчета и составленных на его основе годовых отчетных форм о соблюдении пруденциальных норм, достоверно, во всех существенных аспектах, отражает финансовое положение Банка по состоянию на 1 января 2011 года, результаты его финансово-хозяйственной деятельности и движение денежных средств по указанную дату в соответствии с Законом Республики Беларусь от 18 октября 1994 года № 3321-XII «О бухгалтерском учете и отчетности», «Инструкцией по ведению бухгалтерского учета в банках, расположенных на территории Республики Беларусь», утвержденной постановлением Совета директоров Национального банка Республики Беларусь от 19 сентября 2005 года № 283 с изменениями и дополнениями, «Инструкцией по составлению годового отчета банками Республики Беларусь», утвержденной постановлением Совета директоров Национального банка Республики Беларусь от 27 ноября 2006 года № 323 с изменениями и дополнениями, и другими нормативными правовыми актами Национального банка Республики Беларусь, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и подготовки финансовой отчетности для банков Республики Беларусь и действовавшими в отчетном периоде.

*Поясняющий параграф*

Прилагаемая финансовая отчетность, состоящая из годового отчета и составленных на его основе годовых отчетных форм о соблюдении пруденциальных норм не имеет своей целью представление финансового положения и результатов деятельности в соответствии с принципами или методами бухгалтерского учета, общепринятыми в странах помимо Республики Беларусь. Соответственно, прилагаемая финансовая отчетность не предназначена для лиц, не знакомых с принципами, процедурами и методами бухгалтерского учета, принятыми в Республике Беларусь.

Мы проводили аудит соответствия финансовой отчетности требованиям Национальных стандартов финансовой отчетности только в части положений, регламентирующих представление и раскрытие информации в финансовой отчетности.

Лащенко Павел Анатольевич
Директор ИООО «Эрнст энд Янг»

Квалификационный аттестат аудитора Министерства финансов Республики Беларусь № 0000738 от 14 мая 2003 года, без ограничения срока действия.

Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям, предъявляемым к специалистам, осуществляющим аудиторскую деятельность в банках и НКФО № 8 от 27 октября 2004 года, без ограничения срока действия (дата последнего тестирования — 14 ноября 2008 года).

Житомирская Оксана Геннадьевна
Заместитель директора
по работе с клиентами
ИООО «Эрнст энд Янг»

Квалификационный аттестат аудитора Министерства финансов Республики Беларусь № 0001790 от 6 июля 2007 года, без ограничения срока действия.

Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям, предъявляемым к специалистам, осуществляющим аудиторскую деятельность в банках и НКФО № 35 от 12 сентября 2007 года, без ограничения срока действия (дата последнего тестирования — 5 августа 2010 года).

Дата аудиторского заключения: 25 марта 2011 года
Место выдачи аудиторского заключения: г. Минск, Республика Беларусь
Дата получения аудиторского заключения аудируемым лицом 25 марта 2011 года

Председатель Правления ЗАО «Сомбелбанк» Медведева Т.М.

Директор ИООО «Эрнст энд Янг» Лащенко П.А.

# Памяць людская не старэе

**У нашым календары ёсць дата, якая няўмольна нагадвае нам пра трагічную старонку жыцця беларускага народа. Гэта 11 красавіка — Міжнародны дзень вызвалення вязняў фашысцкіх канцлагераў.**

Веймар (Цюрынгія). Тут жылі і тварылі Гётэ, Шылер, Гердэр, Бах і іншыя славутыя мастакі, паэты, філосафы, кампазітары і архітэктары. У ліпені 1937 года за некалькі кіламетраў ад горада нацысты пачалі будаваць адзін з найбуйнейшых і жахлівейшых канцэнтрацыйных лагераў. «Бухенвальду» было наканавана стаць сімвалам варварства.

Праз браму лагера эсэсаўцы штодня праганялі на працу тысячы зняволеных. Здзекамі і цынізмам быў напоўнены надпіс на браме «Edem das Zeine» (Эдэм дас зайне) — «Кожнаму сваё».

У нядзелю, 8 красавіка 1945 года (за месяц да заканчэння вайны), у эфір над цэнтральнай нямецкай вобласцю Цюрынгіяй нечакана ўварваліся сігналы бедства «SOS» (радыёперадатчык сабралі члены інтэрнацыянальнага лагернага камітэта): «SOS Бухенвальд... Камандуючаму амерыканскай танкавай калоны генералу Патану SOS Бухенвальд... Нас хочуць расстраляць нас хочуць знішчыць просім неадкладнай дапамогі SOS Бухенвальд SOS Бухенвальд SOS Бухенвальд!».

Радыёграма перадавалася на англійскай, нямецкай і рускай мовах. Шматпакутны Бухенвальд больш за ўсё спадзяваўся на амерыканцаў, таму што яны былі побач — вязні ўжо тры дні чулі кананаду, а з перадач па радыё ведалі, што 3-я амерыканская танкавая армія генерала Патана і 4-я бранятанкавая дывізія генерал-маёра Уільяма Хоўга, якая ўваходзіла ў яе, наступалі ў кірунку Бухенвальда. Савецкія войскі былі далёка, і радыёграма да іх не даляцела.

Штаб генерала Патана сігнал бедства вязняў прыняў (гэта дакладны гістарычны факт), але дапамога так і не прыйшла, хоць два амерыканскія самалёты ў хуткім часе пасля сігналу бедства некалькі разоў нізка праляцелі над лагерам — праляцелі павольна, злёгку пакалыхваючы крыламі...

І тады 11 красавіка вязні Бухенвальда адважыліся на ўзброенае паўстанне, якое выратавала дзясяткі тысяч людзей многіх нацыянальнасцяў, таму што напярэдадні камандаванне лагера атрымала загад аб знішчэнні ўсіх зняволеных.

У гады Другой сусветнай вайны ў канцлагеры нацыстамі было кінута каля 18 млн чалавек з усіх краін Еўропы, 11 млн з іх загінулі. З Беларусі ў гады Другой сусветнай вайны ў канцлагерах налічвалася каля 4153 чалавек.

Асабліва цяжкім у канцэнтрацыйным лагеры было становішча дзяцей. Самыя маленькія вязні знаходзіліся ў найбольшай небяспецы, паколькі ў адзіночку яны практычна не маглі прыстасавацца да жыцця ў лагеры. Зняволеныя дарослыя змаглі дабіцца змяшчэння ўсіх дзяцей у асобны «дзіцячы блок» № 8, што дазволіла палепшыць іх жыццёвыя ўмовы. У першую чаргу дарослыя зняволеныя рабілі ўсё магчымае, каб зберагчы дзяцей ад эшалонаў смерці. Сярод вызваленых вязняў Бухенвальда знаходзіліся 904 дзіцяці і падлеткі.

А створаныя ў многіх гарадах рэспублікі гета! Хіба гэта не фізічнае знішчэнне людзей? Толькі ў Мінскім гета са 100 тысяч чалавек удалося выжыць толькі 3—4 тысячам.

Акрамя таго, мы не павінны забываць і той факт, што з сакавіка 1942 года быў пачаты масавы прымусовы вываз працоўнай сілы ў Германію. Усяго з Рэспублікі Беларусь было вывезена ў фашысцкую няволю амаль 400 тысяч чалавек. Вярнулася, на жаль, крыху больш за палову.

Другая сусветная вайна прайшлася бязлітасным каткам па лёсах мільёнаў ні ў чым не вінаватых беларускіх грамадзян, пакуты і знішчэнне іх былі бязмерныя.

Нямецка-фашысцкія захопнікі і іх узброеныя сілы знішчылі ў Беларусі 1409225 мірных грамадзян, 810091 ваеннапалонных і амаль 400 тысяч чалавек загналі ў рабства. На тэрыторыі рэспублікі было створана 220 лагераў, філіялаў, аддзяленняў, турмаў, гета. Шматлікімі актамі, следствам і паказаннямі сведак устаноўлены факты масавых забойстваў, катаванняў, мучэнняў і жорсткага абыходжання з грамадзянамі на акупаванай імі тэрыторыі Беларусі. У горадзе Мінску і яго наваколлях, у М. Трасцянцы, па вул. Шырокай, на хутары Петрушкевічы, ва Уруччы, Драздах і інш. знішчана больш за 317515 грамадзян.

Не менш страшныя звесткі маюцца ў матэрыялах Нюрнбергскага працэсу над нацысцкімі злачынцамі і пра лагеры смерці, пасля аб'яднаныя агульнай назвай «Азарычы» — па назве размешчанага непадалёк пасёлка ў тагачаснай Палескай (цяпер Гомельскай) вобласці, дзе ў сакавіку 1944 года гітлераўцы трымалі за калючым дротам больш за 50 тысяч змучаных голадам, холадам і здзекамі жанчын, старых і дзяцей. Людзі, якія там знаходзіліся, заражаліся сыпным тыфам і былі наўмысна асуджаны на смерць, адыграўшы ў амаль непраходнай эпідэміялагічнай зоне ролю жывога шчыта перад войскамі Чырвонай Арміі, якія наступалі.

18 і 19 сакавіка 1944 года войскі 65-й арміі Беларускага фронту вызвалілі з Азарыцкіх лагераў 33434 чалавекі, якія засталіся жывымі. Сярод іх было 15960 дзяцей да 13 гадоў.

Фондам «Узаемаразуменне і прымірэнне» выдадзены шэраг кніг пра гэтую трагедыю: «Трагедыя Палесся», «Закладнікі вермахта», «Азарычы — боль мая», «Вязні Азарыцкіх лагераў успамінаюць», буклет «65 гадоў вызвалення лагера «Азарычы». Фонд узяў удзел у стварэнні у п. Азарычы музея-помніка. Мастак В. Крываблоцкі падарыў музею шэсць сваіх карцін. Праведзены рэстаўрацыйныя работы ля помніка на месцы лагера «Азарычы».

**Здавалася б, добрага, па-чалавечы ў рэспубліцы зроблена нямала. Аднак зроблена не ўсё. Супрацоўнікі фонду разам з ідэалагічнымі і архіўнымі работнікамі рэспублікі не змаглі дабіцца змянення статуса лагера. Замест назвы «лагер смерці (знішчэння) на пярэднім краі нямецкай абароны» (як гэта вызначыла НДК у 1944 годзе) неабходна было змяніць статус лагера, назваўшы яго «канцэнтрацыйны лагер Азарычы». Гэта, безумоўна, нявыгадна Германіі, таму што пасля вайны ўсё бясчынства спісвалася на войскі СС і СД, а вермахт і рэгулярныя часці, маўляў, толькі ваявалі. Нават калі за вермахтам прызнавалі злачынствы — пра лагер смерці «Азарычы» — не ўзгадвалі. Гэта несправядліва.**

Беларускі рэспубліканскі фонд «Узаемаразуменне і прымірэнне» зрабіў вялікую працу, накіраваную на аказанне дапамогі пацярпелым ад нацыянал-сацыялістычных пераследаў. На 1 студзеня 2007 года фонд завяршыў усе выплаты жывым грамадзянам і выплаты правапераемнікам. Выплату атрымала каля 130 тысяч пацярпелых, якія пражываюць у Беларусі, Эстоніі, дзяржавах СНД.

Цяпер фонд рыхтуе дакументы па кампенсацыйных выплатах для здачы іх у Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Акрамя гэтага, сумесна з Міністэрствам аховы здароўя, Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны насельніцтва і Міністэрствам абароны Рэспублікі Беларусь фондам распрацавана, зацверджана нямецкім бокам і працуе пяць праектаў, накіраваных на лячэнне і аздараўленне былых ахвяр нацызму ў шпіталях інвалідаў вайны, шпіталі Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь. Сёння ў пяці шпіталях штоквартальна праходзяць курс лячэння 520 чалавек, за год гэта лічба перавышае 2000 чалавек.

**Гаворачы пра асноўныя кірункі нашай працы, мы бачым і некаторыя праблемы. Перш за ўсё, мы лічым неабходным прыняцце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ахвярах нацызму». Сёння, калі мы рыхтуемся адзначыць трагічную дату ў жыцці нашага народа — 70-годдзе пачатку Вялікай Айчыннай вайны, гэты закон стаў бы новай праявай клопату нашай дзяржавы пра лёс і жыццё былых вязняў нацызму.**

**Было б нядрэнна сумесна з нямецкімі калегамі стварыць у г. Мінску цэнтр сацыяльнай дапамогі пацярпелым ад нацызму. Падобныя цэнтры нідзе не створаныя, ні ў адной краіне свету, а шкада! Але Беларусь пацярпела ад гітлераўскага нашэсця больш за ўсіх. Справа — за нямецкім бокам.**

У нашай штодзённай працы мы надаём вялікую ўвагу рабоце з грамадскімі арганізацыямі. Пры фондзе створаны і актыўна працуе Каардынацыйная рада грамадскіх арганізацый.

Карыстаючыся магчымасцю, ад імя ўсіх супрацоўнікаў Беларускага рэспубліканскага фонду «Узаемаразуменне і прымірэнне» дазвольце пажадаць усім былым вязням нацызму, якія цяпер жывуць, шчасця, дабрыні, здароўя і даўгалецця. Няхай перажытае вамі ніколі больш не паўторыцца.

Нізкі Вам паклон.

**В. ГЕРАСІМАЎ, старшыня праўлення Беларускага рэспубліканскага фонду «Узаемаразуменне і прымірэнне».**

Рэха публікацыі

# За невыкананне патрабаванняў прыпынена дзеянне ліцэнзіі. Плануецца правесці конкурс на вызначэнне новага перавозчыка



**У «Звяздзе» ад 15 лютага пад рубрыкай «Ёсць праблема» быў змешчаны матэрыял «Нюансы «прыватных перавозак», або Спачатку камфорт, а потым грошы, ці наадварот?». Гаворка ў ім ішла пра пагаршэнне якасці працы маршрутак па маршруце Мінск — Смілавічы. Пра тое напісаць жыхары гарадскога пасёлка прасілі яшчэ ўвосень мінулага года: і пра не вельмі новыя мікрааўтобусы, і пра незахаванне раскладу руху, і пра часам некарэктныя паводзіны вадзіцеляў у дачыненні да пасажыраў. Аднак не хапала канкрэтных фактаў. Але журналіст «Звязды» сам раз-пораз карыстаецца гэтымі маршруткамі, і з пэўнага часу такая канкрэтная інфармацыя пачала назапашвацца ў тым ліку ўжо ім асабіста. Напрыклад, у адзін з першых дзён студзеня аўтар гэтых радкоў ледзь не выпаў з маршруткі падчас руху, бо заднія дзверы практычна расчыніліся — адышла звычайная металічная клямка. Згадвалі мы і гісторыю пра тое, як падчас руху ў другой машыне літаральна сарвала дах. Цудам ніхто не пацярпеў. «Такім ветрам дахі ў дамоў зносіць, не тое, што ў мікрааўтобуса», — неяк будзёна пракаментавалі той выпадак нам прадстаўнікі прадпрыемства-перавозчыка. Прыкладна такія ж адказы мы пачулі і па астатніх пытаннях, а іх было нямала.**

Карацей кажучы, паразумення з прадстаўнікамі фірмы не было. Таму мы мусілі накіраваць матэрыял у Міністэрства транспарту і камунікацый для рэагавання. Пры гэтым назву перавозчыка ў артыкуле не паведамлялі, пісалі пра тое, што гэтае прадпрыемства не павінна пацярпець, калі на тое сапраўды няма падстаў. Згадвалі ў гэтым кантэксце пра неабходнасць канкурэнцыі, ад якой спажывец толькі ў выйгрышы. Але ж калі яно не можа забяспечыць элементарны камфорт для пасажыраў пры перавозках і, самае галоўнае, іх бяспеку, выключыць рызыку для здароўя як мінімум — тады, прабачце, трэба саступіць дарогу іншаму перавозчыку, які здолее выканаць гэтыя і іншыя ўмовы і патрабаванні. Нарэшце рэдакцыя атрымала афіцыйны адказ з міністэрства.

«У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 14 жніўня 2007 г. «Аб аўтамабільным транспарце і аўтамабільных перавозках», мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы забяспечваюць арганізацыю аўтамабільных перавозак пасажыраў па тэрыторыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, выступаюць заказчыкамі гарадскіх, прыгарадных і міжгародніх унутрыабласных аўтамабільных перавозак пасажыраў у рэгулярных зносінах, ажыццяўляюць кантроль за арганізацыяй і выкананнем аўтамабільных перавозак пасажыраў у рэгулярных зносінах. Заказчыкам аўтамабільных перавозак пасажыраў па Мінскай вобласці з'яўляецца Мінскі абласны выканаўчы камітэт, па яго рашэнні аператарам аўтамабільных перавозак пасажыраў — ААТ «Мінаблаўтатранс».

Аўтамабільныя перавозкі пасажыраў у рэгулярных зносінах выконваюцца ў адпаведнасці з дагаворамі аб арганізацыі аўтамабільных перавозак пасажыраў, заключаных заказчыкам такіх перавозак з аўтамабільнымі перавозчыкамі. Дагаворам аб арганізацыі аўтамабільных перавозак пасажыраў вызначаюцца маршрут, расклад, інтэрвалы руху транспартных сродкаў з вызначанымі пачаткам і заканчэннем работы, колькасць рэйсаў па маршруце, тэрміны падачы транспартных сродкаў, тып і колькасць транспартных сродкаў, што выкарыстоўваюцца, патрабаванні да іх і адказнасць бакоў, парадак разліку за аўтамабільныя перавозкі пасажыраў.

Зараз кірунак Мінск—Смілавічы абслугоўваецца перавозчыкамі ДП «Мінсктранс» і ТАА «Інфаст», пра якое ідзе гаворка ў артыкуле.

Па інфармацыі аператара пасажырскіх перавозак на тэрыторыі Мінскай вобласці ААТ «Мінаблаўтатранс», ТАА «Інфаст» абслугоўвае гэты маршрут з 2004 года, і да цяперашняга часу перавозачны працэс у названым кірунку забяспечваўся ў поўным аб'ёме. Для ажыццяўлення перавозак пасажыраў перавозчыкам выкарыстоўваецца рухомы састаў 2004-2008 гадоў выпуску. Прэтэнзій ад пасажыраў на якасць абслугоўвання гэтым перавозчыкам у ААТ «Мінаблаўтатранс» не паступала.

Транспартнай інспекцыяй Мінтранса сумесна з Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыяй і інспекцыяй Міністэрства па падатках і зборах пастаянна праводзяцца кантрольна-прафілактычныя мерапрыемствы ў сферы транспартнай дзейнасці, пры гэтым асаблівая ўвага надаецца пытанням выкаранення дзейнасці асобаў, што выконваюць перавозкі пасажыраў з парушэннем нормаў дзейнага заканадаўства.

Пры правядзенні кантрольных мерапрыемстваў Транспартнай інспекцыяй Мінтранса на працягу 2010—2011 гадоў у дачыненні да ТАА «Інфаст» складзена восем актаў пазапланавых тэматычных аператыўных праверак. Па выніках праверак ТАА «Інфаст» выдадзена прадпісанне аб выпраўленні выяўленых парушэнняў. Акрамя таго, за дапушчаныя парушэнні работнікі ТАА «Інфаст» неаднаразова прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці па артыкулах Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях. Па фактах выяўленых парушэнняў заканадаўства аб ліцэнзаванні, ліцэнзійных патрабаванняў і ўмоў ажыццяўлення ліцэнзійнай дзейнасці ТАА «Інфаст», на падставе пададзеных Транспартнай інспекцыяй матэрыялаў пытанне аб дзейнасці ТАА «Інфаст» будзе разгледжана на чарговым пасяджэнні калегіі Міністэрства транспарту і камунікацый з прыняццем рашэння ў адпаведнасці з заканадаўствам...»

**P.S.** *Пакуль рыхтавалася гэтая публікацыя, у міністэрстве прайшла згаданая калегія, на якой у тым ліку было разгледжана пытанне адносна дзейнасці ТАА «Інфаст». Як нам удакладнілі ў Мінтрансе, за невыкананне патрабаванняў Транспартнай інспекцыі (і на падставе выкладзенай у «Звяздзе» інфармацыі, якая была праверанай), у ТАА «Інфаст» прыпынена на адзін месяц дзеянне ліцэнзіі — з 10 красавіка. Фактычна гэта азначае страту маршруту гэтым перавозчыкам, паколькі на ім вядуцца штодзённыя рэгулярныя перавозкі. Бліжэйшым часам плануецца правесці конкурс на вызначэнне новага перавозчыка, які будзе абслугоўваць маршрут. Пасажыры ў любым выпадку не павінны пацярпець, запэўнілі нас у міністэрстве, перавозкі па згаданым маршруце будуць выконвацца. Нават у прамежак часу паміж прыпыненнем дзейнасці ліцэнзіі ранейшага перавозчыка і да моманту, калі аператыўна не будзе вызначаны і абвешчаны пераможца конкурсу па вызначэнні новага перавозчыка.*

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ПАСЛУГА СЯДЗЕЛКІ Ў СТАЛІЦЫ — З ПАДТРЫМКАЙ

**Жыхары сталіцы, якія маюць сур'ёзныя праблемы са здароўем, атрымаюць больш магчымасцяў для карыстання матэрыяльнай падтрымкай пры аплаце паслуг сядзелак. Аб гэтым карэспандэнту «Звязды» паведаміла намеснік начальніка ўпраўлення сацыяльнай падтрымкі насельніцтва — начальнік аддзела па рабоце з ветэранамі, інвалідамі і пажылымі людзьмі камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Ірына Дудка.**

У прыватнасці, адзначыла Ірына Дудка, унесены змяненні ў гарадскую праграму развіцця сацыяльнага абслугоўвання на 2011—2015 гады. Паводле гэтых змяненняў, непрацаздольныя мінчане, якія цалкам страцілі магчымасць да самаабслугоўвання, могуць разлічваць на кампенсацыю фактычных выдаткаў на аплату паслуг сядзелак у памеры да бюджэту пражытковага мінімуму (сёння БПМ складае каля 296 тыс. рублёў) адзін раз у месяц. Раней такое права мелі толькі адзінокія непрацаздольныя жыхары горада з нізкім узроўнем пенсіі.

Змяненнямі ў праграме таксама прадугледжана: штомесячная выплата сацыяльнай дапамогі да пенсій удовам асоб, якія мелі званне «Ганаровы грамадзянін горада Мінска» — пры ўмове, што ўдовы не ўзялі другі шлюб, дасягнулі агульнаўстанаўленага пенсійнага ўзросту і знаходзяцца на ўліку ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. Памер гэтай сацыяльнай дапамогі складзе 300 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросце. Сёння мінімальная пенсія па ўзросце вызначана ў 74.220 рублёў.

І яшчэ адзін цікавы момант. Вырашана, што мінскія вучні агульнаадукацыйных устаноў і навучэнцы ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне сярэдняй адукацыі, змогуць бясплатна ездзіць на аўтамабільным транспарце рэгулярных гарадскіх зносін, у метро, а таксама ў гарадскім электратранспарце — і ў тым ліку ў будучай гарадской хуткаснай электрычцы. Апроч таго, вызначана, што ў сталіцы ўстанаўліваецца 60 прэмій у памеры па 10 базавых велічынь кожная для студэнтаў ВНУ за актыўны ўдзел у навуковым, грамадскім і культурным жыцці Мінска, а таксама 100 прэмій зноў жа па 10 базавых велічынь вучням бюджэтных агульнаадукацыйных устаноў за высокія поспехі на гарадскіх, рэспубліканскіх і міжнародных алімпіядах, у конкурсах, канферэнцыях і турнірах, творчых і спартыўных спаборніцтвах.

**Сяргей ГРЫБ.**

**ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 12 мая 2011 г. в 15.00 СОСТОИТСЯ**

**ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА ПО АДРЕСУ: г. БОБРУЙСК, ул. РОГАЧЕВСКАЯ, 37, принадлежащего на праве собственности Белорусскому республиканскому союзу потребительских обществ – Белкоопсоюзу, на праве хозяйственного ведения - Частному производственному унитарному предприятию «Деревообрабатывающий комбинат Белкоопсоюза»**

| Наименование и адрес имущества должника (предмет торгов): | | Площадь земельного участка, га | Начальная цена продажи имущества должника, рублей без учета НДС |
|---|---|---|---|
| ЛОТ № 1 | Здание лесоцеха общей площадью 1 764,4 кв.м | 1,2210, кадастр. № 741000000009001815, правовой режим – пост. пользование. После продажи здания с торгов будет создан самост. зем. участок оптимал. пл. **0,6461 га** | 571 610 000 руб., размер задатка – 57 161 000 руб. |
| ЛОТ № 2 | Здание цеха ширпотреба общей площадью 1 032,0 кв.м | **0,4031 га**, кадастр. № 741000000009001811, правовой режим – пост. пользование | 299 770 000 руб., размер задатка – 29 977 000 руб. |
| ЛОТ № 3 | Здание мебельного цеха общей площадью 995,4 кв.м с забором кирпичным протяженностью 65,0 м | 0,8472, кадастр. № 741000000009001812, правовой режим – пост. пользование. После продажи здания с торгов будет создан самост. зем. участок оптимал. пл. **0,4262 га** | 272 296 202 руб., размер задатка – 27 229 620 руб. |
| ЛОТ № 4 | Здание полимерного цеха общей площадью 698,8 кв.м с забором кирпичным протяженностью 31,47 м | 0,3797, кадастр. № 741000000006005152, правовой режим – пост. пользование. После продажи здания с торгов будет создан самост. зем. участок оптимал. пл. **0,1697 га** | 201 753 716 руб., размер задатка – 20 175 370 руб. |
| ЛОТ № 5 | Здание пленки общей площадью 371,0 кв.м | 1,2210, кадастр. № 741000000009001815, правовой режим – пост. пользование. После продажи здания с торгов будет создан самост. зем. участок оптимал. пл. **0,2379 га** | 125 600 000 руб., размер задатка – 12 560 000 руб. |
| ЛОТ № 6 | Здание главного склада общей площадью 476,3 кв.м с забором кирпичным протяженностью 18,27 м | **0,1358 га**, кадастр. № 741000000006005263, правовой режим – пост.пользование | 111 724 149 руб., размер задатка – 11 172 400 руб. |
| ЛОТ № 7 | Здание цеха РМЦ общей площадью 345,0 кв.м с забором кирпичным протяженностью 74,19 м | 0,3797, кадастр. № 741000000006005152, правовой режим – пост. пользование. После продажи здания с торгов будет создан самост. зем. участок оптимал. пл. **0,1442 га** | 85 678 325 руб., размер задатка – 8 567 830 руб. |
| ЛОТ № 8 | Здание склада общей площадью 116,8 кв.м с забором кирпичным протяженностью 1,13 м | 0,3797, кадастр. № 741000000006005152, правовой режим – пост. пользование. После продажи здания с торгов будет создан самост. зем. участок оптимал. пл. **0,0658 га** | 24 803 549 руб., размер задатка – 2 480 350 руб. |
| ЛОТ № 9 | Здание конторы общей площадью 203,7 кв.м | 0,0568, кадастр. № 741000000009001813, правовой режим – пост. пользование. После продажи здания с торгов будет создан самост. зем. участок оптимал.пл. **0,0479 га** | 86 900 000 руб., размер задатка – 8 690 000 руб. |
| ЛОТ № 10 | Здание проходной общей площадью 12,1 кв.м | 0,0568, кадастр. № 741000000009001813, правовой режим – пост. пользование. После продажи здания с торгов будет создан самост. зем. участок оптимал. пл. **0,0089 га** | 4 840 000 руб., размер задатка – 484 000 руб. |
| ЛОТ № 11 | Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-61452 (здание рыбного цеха) общей площадью 181,6 кв.м | 0,8472, кадастр. № 741000000009001812, правовой режим – пост. пользование. После продажи здания с торгов будет создан самост. зем. участок оптимал. пл. **0,1211 га** | 51 200 000 руб., размер задатка – 5 120 000 руб. |
| ЛОТ № 12 | Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-61453 (навес металлический) общей площадью 201,1 кв.м | 0,8472, кадастр. № 741000000009001812, правовой режим – пост. пользование. После продажи навеса с торгов будет создан самост. зем. участок оптимал. пл. **0,0820 га** | 14 240 000 руб., размер задатка – 1 424 000 руб. |
| ЛОТ № 13 | Навес металлический общей площадью 711,5 кв.м | 1,2210, кадастр. № 741000000009001815, правовой режим – пост.пользование. После продажи навеса с торгов будет создан самост. зем.участок оптимал. пл. **0,3369 га** | 63 240 000 руб., размер задатка – 6 324 000 руб. |
| ЛОТ № 14 | Навес металлический общей площадью 313,4 кв.м | 0,8472, кадастр. № 741000000009001812, правовой режим – пост. пользование. После продажи навеса с торгов будет создан самост. зем. участок оптимал. пл. **0,0697 га** | 22 950 000 руб., размер задатка – 2 295 000 руб. |
| ЛОТ № 15 | Навес металлический общей площадью 346,1 кв.м | **0,0260 га,** кадастр. № 741000000009001814, правовой режим – пост. пользование | 31 870 000 руб., размер задатка – 3 187 000 руб. |
| ЛОТ № 16 | Навес металлический общей площадью 481,9 кв.м | 0,8472, кадастр. № 741000000009001812, правовой режим – пост. пользование. После продажи навеса с торгов будет создан самост. зем. участок оптимал. пл. **0,1534 га** | 35 550 000 руб., размер задатка – 3 555 000 руб. |
| ЛОТ № 17 | Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-60312 (навес металлический) общей площадью 232 кв.м | **0,0269 га,** кадастровый номер 741000000006005151, правовой режим – постоянное пользование | 22 797 000 руб., размер задатка – 2 279 700 руб. |
| ЛОТ № 18 | Эстакада для подачи бревен в лесоцех | на вывоз | 5 630 214 руб., размер задатка – 563 020 руб. |

| | |
|---|---|
| **Продавец** | **Частное производственное унитарное предприятие «Деревообрабатывающий комбинат Белкоопсоюза», УНН 700015606, находящееся в процедуре банкротства** (213804, г. Бобруйск, ул. Рогачевская, 37) |
| Организатор торгов | Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» (220034, г. Минск, ул. Чапаева, 4-222, р/с 3012105618010 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Банк», код 369, УНН 102353509, ОКПО 55484006) |
| **Место проведения торгов и подачи документов** | **г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 в здании Бобруйского управления Филиала «Центр «Белтехинвентаризация»** |
| **Номер расчетного счета продавца для перечисления задатка** | **Получатель платежа ЧУП «Деревообрабатывающий комбинат Белкоопсоюза» - р/с 3012112230002 в ОАО «АСБ Белвнешэкономбанк» отделение в г. Бобруйске, код 214, УНН 700015606, ОКПО 01789685** |

**Характеристика предмета торгов:**

**ЛОТ № 1**: здание лесоцеха 1970 г.п., 1-2-этажное, кирпичное, перекрытия – ж/бетонные, фундамент – бутовый, кровля – совмещенная; **ЛОТ № 2**: здание цеха ширпотреба 1971 г.п., 1-2-этажное, кирпичное, перекрытия – ж/бетонные, фундамент – бетонный, кровля – совмещенная; **ЛОТ № 3**: здание мебельного цеха 1971 г.п., 1-этажное, кирпичное, перекрытия – ж/бетонные, фундамент – бутовый, кровля – совмещенная; **ЛОТ № 4**: здание полимерного цеха 1989 г.п., 1-этажное, кирпичное, перекрытия – ж/бетонные, фундамент – бутовый, кровля – совмещенная, имеется навес; **ЛОТ № 5**: здание пленки 1995 г.п., 1-этажное, кирпичное, пристройка панельная, перекрытия – деревянные, фундамент – бутовый, кровля – шифер, имеется навес; **ЛОТ № 6**: здание главного склада 1980 г.п., 1-этажное, кирпичное, перекрытия – ж/бетонные, фундамент – бутовый, кровля – совмещенная; **ЛОТ № 7**: здание цеха РМЦ 1961 г.п., 1-этажное, кирпичное, перекрытия – ж/бетонные, фундамент – бутовый, кровля – совмещенная; **ЛОТ № 8**: здание склада 1980 г.п., 1-этажное, кирпичное, перекрытия – ж/бетонные, фундамент – бутовый, кровля – совмещенная; **ЛОТ № 9**: здание конторы 1960 г.п., 1-этажное, кирпичное, перекрытия – деревянные, фундамент – бутовый, кровля – шифер; **ЛОТ № 10**: здание проходной 1962 г.п., 1-этажное, кирпичное, перекрытия – деревянные, фундамент – бутовый, кровля – шифер; **ЛОТ № 11**: здание рыбного цеха 1962 г.п., 1-этажное, кирпичное, перекрытия – деревянные, фундамент – бутовый, кровля – шифер, имеется навес; **ЛОТ № 12** - **№ 17:** навесы металлические, полы бетонные, асфальтовые, кровля – шифер; **ЛОТ № 18** – эстакада металлическая протяженностью 52 м.

| | |
|---|---|
| Условия продажи | Аукцион без условий |
| Срок заключения договора купли-продажи | в течение 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов |
| Срок и условия оплаты за предмет торгов | определяются по согласованию Победителя торгов с Продавцом при заключении договора купли-продажи, но не позднее одного месяца со дня проведения торгов |
| **Срок подачи документов для участия в торгах, осмотра предмета торгов и внесения задатка** | **с 11 апреля по 10 мая 2011 г. включительно до 17.30** |

**Для участия в торгах лица, заявившие о своем участии в них, должны предоставить по указанному адресу следующие документы**: заявление на участие в торгах; платежное поручение о внесении участником торгов суммы задатка с отметкой банка об исполнении, паспорт; **для резидентов Республики Беларусь**: **юр. лицам** – доверенность представителю юр.лица (в случае необходимости таковой), копии и оригиналы учредительных документов и свидетельства о гос. регистрации; **представителям физ.лиц** – нотариально заверенную доверенность; **для нерезидентов Республики Беларусь**: **юр. лицам** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена не ранее чем за 6 мес. до подачи заявления на участие в торгах) или иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; **юр. лицам и физ. лицам** – документ о состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорус. (рус.) язык; **представителям юр. лиц и физ. лиц** – легализованную в установленном порядке доверенность.

**Порядок проведения торгов**: **Шаг аукциона определяется в размере от 5 до 15 процентов от начальной цены имущества должника. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. По завершении торгов составляется протокол об итогах проведения торгов, который подписывается победителем и членами аукционной комиссии и является основанием для заключения договора купли-продажи. В случае, если заявка на участие в торгах подана только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.** Задаток, внесенный Победителем торгов будет зачтен в счет окончательной стоимости приобретенного предмета торгов, остальным участникам будет возмещен в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов. Организатор торгов (продавец) вправе снять имущество с торгов до объявления его проданным.

**Победитель (Претендент на покупку)** возмещает затраты на организацию и проведение торгов в следующем размере: 1% от цены продажи Лота № 1; 2% от цены продажи Лотов № 2 - № 4; 3% от цены продажи Лотов № 5 и № 6; 5% от цены продажи Лотов №7, №9, № 11 и № 13; 10% от цены продажи Лотов № 8, № 10, № 12, № 14 - № 18 и в срок не позднее 3 раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов на основании счета-фактуры, выдаваемой Организатором торгов.

**Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 52 08 45, 52 70 32, 8 (029) 654 79 06 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.**

## Забаронены ўвоз свініны з Мурманскай вобласці

**Беларусь увяла часовую забарону на ўвоз свініны з Мурманскай вобласці Расіі, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання.**

Увядзенне забароны звязана з успышкай афрыканскай чумы свіней у рэгіёне. Забарона распаўсюджваецца на ўвоз жывых свіней, спермы кныроў, мяса свініны і прадуктаў яе перапрацоўкі, скуранай і кішэчнай сыравіны, шчаціння дзікоў, мяса дзікоў, паляўнічых трафеяў, кармоў і дабавак для сельскагаспадарчых жывёл, а таксама былога ва ўжытку абсталявання для ўтрымання, забою і разбірання свіней.




# НАСЕННЕ ОПІЙНАГА МАКУ ПЕРАСТАНУЦЬ ПУСКАЦЬ НА ТЭРЫТОРЫЮ БЕЛАРУСІ?

Рыхтуецца нарматыўны акт, які забароніць бесперашкодна ўвозіць у краіну так званыя «бубкі» — сыравіну для самага папулярнага ў нас ін'екцыйнага наркотыку

**Ужо больш за сем гадоў у Беларусі распаўсюджваюцца паўлегальныя «бубкі» — насенне маку, штучна насычанае опіем. Наркаспажыўцы купляюць гэтую сыравіну і ў хатніх умовах з дапамогай хімічнага растваральніка гатуюць наркатычны раствор — так званую «шырку». Па словах беларускіх нарколагаў, «шырка» ўтрымлівае апіоіды (кадэін, марфін, монаацэцілмарфін), якія выклікаюць залежнасць, аналагічную гераінавай.**

Яшчэ ў 2009 годзе, па звестках Міністэрства аховы здароўя, 70% беларускіх наркаспажыўцоў спажывалі «бубкі».

У беларускай прэсе друкаваліся страшныя лічбы па ін'екцыйных наркаспажыўцах (амаль усе яны «бубачнікі») — больш за 140 тысяч чалавек.

«Бубкі» ў вялізных аб'ёмах завозіліся на тэрыторыю Беларусі. Наша заканадаўства дагэтуль не забараняе гэтага рабіць.

І вось з'явілася інфармацыя пра тое, што ўвоз на тэрыторыю Беларусі «бруднага» маку можа быць нарэшце забаронены. Гэтую інфармацыю журналісту «Звязды» пацвердзілі ў Міністэрстве ўнутраных спраў.

*— Прапрацоўваецца пытанне аб тым, каб увогуле забараніць увоз на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь маку, які не адпавядае ДАСТу. Адказнасць за прапрацоўку гэтага нарматыўнага акта рашэннем каардынацыйнай рады ўскладзена на Мытны камітэт, — распавядае* ***Васіль ЛОСІЧ, намеснік начальніка Упраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі МУС Беларусі.*** *— У нас адбылася працоўная сустрэча, афармленая пратаколам. Мытнаму камітэту было даручана выпрацаваць праект нарматыўнага акта, які, спадзяюся, будзе прыняты пастановай Савета Міністраў.*

У мінулым годзе на старонках «Звязды» выйшла журналісцкае расследаванне *«Ці прадаецца самы папулярны ў Беларусі наркотык на кожным кроку?»* (нумар за 26 кастрычніка 2010 года). Журналіст «Звязды» купіў «бубкі» ў шэрагу месцаў: у кіёску непадалёк ад цэнтра Мінска, на рынку «Ждановічы», на кропцы ў адным з райцэнтраў. Пазней журналіст здолеў трапіць у наркапрытон і сваімі вачыма пабачыў, як наркаспажыўцы гатуюць «шырку»...

Чаму «бубкі» заваявалі такую папулярнасць у Беларусі? Доўгі час барыгі свабодна гандлявалі опійным насеннем маку, і пакараць іх было амаль немагчыма. Дробныя штрафы адбіваліся вельмі хутка, і макавыя гандляры працягвалі, не хаваючыся, збываць наркатычнае насенне беларусам.

26 ліпеня мінулага года быў прыняты новы дзяржаўны стандарт па харчовым маку. Любыя дамешкі (найчасцей барыгі прадавалі насенне, перамяшанае з макавай саломкай) былі забаронены. З таго моманту прадаць можна было толькі расфасаваны харчовы мак у пакетах вагой да 200 грамаў. Макам па законе могуць займацца толькі афіцыйныя вытворцы або юрыдычныя асобы, якія маюць сертыфікат адпаведнасці на серыйную вытворчасць. Але барыг гэта не спыніла. Продаж працягваўся, а даказваць, што наркагандляр мае намер збыць менавіта опійны мак, было вельмі складана. Пра канкрэтныя крымінальныя справы, якія скончыліся абвінаваўчымі прысудамі, журналісты так і не даведаліся.

Міністэрства ўнутраных спраў яшчэ ў сярэдзіне 2000-х прапаноўвала варыянты, як вырашыць у Беларусі праблему з «бубкамі». Але не ўсе ведамствы пайшлі насустрач міліцыі.

Такім чынам, супрацоўнікам упраўленняў і аддзелаў па наркакантролі заставалася толькі выкрываць дробныя прытоны. А опійнае насенне маку дагэтуль пастаўляецца ў краіну і заваёўвае новых і новых прыхільнікаў.

### Які закон абароніць краіну ад «бубак»?

«Звязда» ўжо не раз друкавала прапановы па вырашэнні праблемы. Асноўныя тэзісы рыхтаваліся пры дапамозе прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый, міліцыі і медыкаў.

Цудоўна, калі новы нарматыўны акт забароніць увоз у краіну маку, які не адпавядае дзяржаўным стандартам. Але ж «бубкі» таксама бываюць рознымі. Па словах саміх наркаспажыўцоў, з якімі сустракаўся журналіст «Звязды», здаралася, у краіне з'яўлялася апыленае опіем насенне без аніякіх дамешкаў макавай саломкі. І высветліць на вока, ці адпавядае такі мак дзяржаўным стандартам, складана.

Таму міліцыя даўно прапаноўвала манапалізаваць пастаўкі харчовага маку ў Беларусь. Даць права ўвозіць прадукт не кожнаму сустрэчнаму, а толькі некалькім абраным арганізацыям.

Яшчэ адна праблема — адкрытыя межы. І супольная мытная прастора яшчэ больш аблегчыць пастаўкі «бубак» у Беларусь. Тым больш што «бруднае» насенне пастаўляецца пераважна з Усходу.

Што застаецца ў гэтым выпадку? Правяраць вагоны, фуры, рабіць экспертызы маку (у нас ёсць усе ўмовы правяраць, ці насычана насенне опіем) і расцэньваць спробы правозу «бубак» як кантрабанду наркотыкаў.

Калі ў нарматыўных актах па барацьбе з распаўсюджваннем наркаманіі «слізкія» моманты будуць улічаны, гэта будзе відавочны крок наперад.

**Яўген ВАЛОШЫН.**



